

ШТО АБМЯЖОЎВАЕ ВОЛЬНАГА ПРАЦАЎНІКА?

МС

КАЛІ СТАРАСТА — ГАСПАДАР



МС

Выдаецца з 9 жніўня 1917 г.

Родная газета на роднай мове

# ЗВЯЗДА

31 мая 2019 г.
ПЯТНІЦА
№ 100 (28967)

9-24 стар. МЯСЦОВАЕ САМАКІРАВАННЕ +TV ПРАГРАМА

## ЦЫТАТА ДНЯ



**Сяргей РУМАС, прэм'ер-міністр:**

*«Праграма сямейнага капіталу зарэкамендавала сябе як эфектыўны стымул павышэння нараджальнасці. Сёння ўжо можна прызнаць высокую эфектыўнасць гэтай меры. У сярэднім тэмпы росту колькасці дзяцей, народжаных трэцімі і наступнымі, за 2015—2018 гады склалі 136,2 % у адносінах да 2011—2014 гадоў. Калі за той перыяд трэцімі і наступнымі нарадзілася 61,1 тысячы дзяцей, то за апошнія тры гады — 83,2 тысячы».*

# Кажан-гарадоцкі вернісаж



Народнаму рукадзеллю — вязаць дыванкі круглай і авальнай формы для хатняга інтэр'ера — Валянціна БУРА, жыхарка аграгарадка Кажан-Гарадок Лунінецкага раёна, навучылася ад сваіх майстравітых цётак. Калі ёсць час і неабходны матэрыял (з непатрэбнага адзення), Валянціна наразае стужкі і дае волю фантазіі: яна любіць спалучэнне фарбаў, а ад прыгожых колераў яе «кружкі» — так па-мясцоваму кажуць пра гэтыя вырабы — робяцца цяплейшыя і нават вясёлкавыя. Двор гаспадыні, калі яна вывешвае свае дыванкі, нагадвае сапраўдную галерэю народнага мастацтва.

**Анатоль КЛЯШЧУК, фота аўтара.**

## КОРАТКА

- **Пасол Беларусі ў Расіі Уладзімір Сямашка надзелены паўнамоцтвамі намесніка прэм'ер-міністра па пытаннях дзейнасці Беларусі ў рамках Саюзнай дзяржавы.**
- Беларусь з 1 чэрвеня павышае экспартныя пошліны на нафту і нафтапрадукты.
- **МАЗ пачаў прадаваць грузавыя фургоны і мікрааўтобусы брэсцкай зборкі.**



- Колькасць турыстаў у Белавежскай пушчы ў студзені — маі павялічылася на 6 %.
- **У Віцебску адзінаццацікласнік дапамог затрымаць рабаўніка.**

Спадчына

## ЛЯМУСЫ-ДВАЙНІКІ?

### Чаму ў Гродне блытаюць старажытныя будынкі

**У горадзе зараз на слыху два лямусы. І абодва папулярныя ў турыстаў, хоць і маюць розныя функцыі. А блытаніна ўзнікла нядаўна, калі пачалася актыўная рэканструкцыя Брыгіцкага кляштарнага комплексу. Менавіта на яго тэрыторыі знаходзіцца драўляны лямус — самы старажытны драўляны будынак у Беларусі. Нядаўна ён стаў даступны для турыстаў. Цікава, што гэтыя аб'екты — з розных гістарычных эпох і рознага прызначэння.**

СТАР. 4



Былы цагляны лямус змяніў аблічча.

Камунальныя стасункі

## Энергія смецця

### У сталіцы будуць збіраць і перапрацоўваць больш адходаў і раздаваць кантэйнеры

**Участкі для смеццеперапрацоўкі і вытворчасці паліва з адходаў створаць у сталіцы, а энергію цвёрдых камунальных адходаў Мінска, прыдатных для перапрацоўкі, будуць выкарыстоўваць у якасці паліва на кацельнях. На кантэйнерах для раздзельнага збору адходаў і пляцоўках для смецця з'явяцца спецыяльныя наклейкі, а ўласнікі прыватных сядзіб атрымаюць па дзве сметніцы для збору звычайных адходаў і другаснай сыравіны. Пра гэта і іншыя навінкі і знаходкі тэхналогіі перапрацоўкі і раздзельнага збору смецця расказалі спецыялісты.**

### Сарціроўка і другаснае паліва

Штогод каля 620 тысяч тон смецця, утворанага мінчанамі і гасцямі сталіцы, вывозіцца на захаванне на палігон. Асобна сабраных адходаў выкідваецца каля 17 тысяч тон. Летась з 818 тысяч тон цвёрдых камунальных адходаў (ЦКА) была выбрана 191 тысяча тон другаснай сыравіны і 149 тысяч тон лому і каляровых металаў.

Хоць закон аб абарачэнні з адходамі патрабуе, каб да 2020 года не менш як 20 % ад агульнага аб'ёму ЦКА выкарыстоўвалася паўторна, новыя магутнасці для перапрацоўкі смецця, якія з'яўляюцца ў сталіцы, дазваляюць спадзявацца, што да 2020—2021 гг. гэтая лічба можа скласці ўжо каля 30 %.

Такому павелічэнню здольны паспрыяць новыя вытворчасці, якія плануюцца сёлета да ўводу на УП «Экарэс», што дазволіць перапрацоўваць 15 тысяч тон адходаў, на сартавальным заводзе ГП «Экалогія горада»(150 тысяч тон), на лініі па кампаставанні адходаў зялёнай масы і драўніны на УП «Мінскзеленбуд» магутнасцю не менш чым 70 тысяч м³ у год.

СТАР. 2

ISSN 1990 - 763X

ЗВЯЗДА Да чытача з любоўю!

Ідзе падпіска на «Звязду» на III квартал і II паўгоддзе

Мы абяцаем цікавае лета з любімай газетай

ЗАСТАВАЙЦЕСЯ З НАМІ – НЕ ПАШКАДУЕЦЕ!

# ХАЙ ДОБРЫ БУДЗЕ ШЛЯХ!

**Прэзідэнт Аляксандр Лукашэнка накіраваў прывітанне выпускнікам устаноў агульнай сярэдняй адукацыі краіны, паведамілі ў прэс-службе кіраўніка дзяржавы.**

Прэзідэнт адзначыў, што апошні школьны званок азначае пачатак новага, дарослага жыцця, адкрывае дзверы ў свет вялікіх магчымасцяў, адказных рашэнняў, амбіцыйных планаў.

«Сёння вы развітваецеся з цудоўным часам, напоўненым рамантыкай школьных будняў, развітваецеся з настаўнікамі і аднакласнікамі. Дарыце цёплыя словы падзякі педагогам за салідны багаж ведаў, сябрам — за дапамогу і падтрымку, бацькам — за тое, што былі побач і мудра накіроўвалі на гэтым шляху, — гаворыцца ў прывітанні. — Вам трэба будзе зрабіць першы самастойны выбар прафесіі, інвеставаць усе свае веды і набыты вопыт у стварэнне ўласнай паспяховай будучыні».

Аляксандр Лукашэнка выказаў перакананне, што выпускнікамі рухаюць высакародныя імкненні і яны гатовыя накіраваць энергію маладосці, розум, талент на рэалізацыю высокіх мэт у імя міру і росквіту роднай Беларусі.

## ПРАМАЯ СУВЯЗЬ

**Традыцыйныя прамыя тэлефонныя лініі адбудуцца 1 чэрвеня ў аблвыканкамах і Мінгарвыканкаме. На пытанні жыхароў краіны з 9 да 12 гадзін адкажуць:**

намеснік старшыні БРЭСЦКАГА аблвыканкама Андрэй Анатолевіч КЛЕЦ. Тэл. 8 016 221 31 21;

намеснік старшыні ВІЦЕБСКАГА аблвыканкама Уладзімір Мікалаевіч БЕЛАВУС. Тэл. 8 021 222 22 22;

кіраўнік спраў ГОМЕЛЬСКАГА аблвыканкама Алена Уладзіміраўна КЛІЧКОЎСКАЯ. Тэл. 8 023 233 12 37;

намеснік старшыні Гродзенскага аблвыканкама Віктар Андрэевіч ЛІСКОВІЧ. Тэл. 8 015 273 56 44;

кіраўнік спраў МАГІЛЁЎСКАГА аблвыканкама Рыгор Аляксандравіч ВАРОНІН. Тэл. 8 022 250 18 69;

першы намеснік старшыні МІНСКАГА аблвыканкама Ігар Мікалаевіч МАКАР. Тэл. 500 41 60;

кіраўнік спраў Мінскага гарвыканкама Ганна Мар'янаўна МАЦЕЛЬСКАЯ. Тэл. 222 44 44.

# «Багіня ўрадлівасці» чакае герояў

## На «БелАгра» вызначаць «Найлепшага аратага» і «Чэмпіёна смаку»

**Упэўніца ў якасці беларускай прадукцыі і набыць тэхніку, жывёлу і расаду запросіць XXIX Міжнародная спецыялізаваная выстаўка «БелАгра» ў рамках Беларускага аграпрамысловага тыдня.**

Цікава будзе нават тым, хто ў звычайным жыцці далёкі ад сельскай гаспадаркі, упэўнены **намеснік міністра сельскай гаспадаркі і харчавання Уладзімір ГРАКУН.** Што чакае ўдзельнікаў і наведвальнікаў форуму аграрыяў, журналісты даведаліся на прэс-канферэнцыі ў Нацыянальным прэс-цэнтры.

Па інфармацыі Уладзіміра Гракуна, сёлета ў выстаўцы возьмуць удзел каля 560 кампаній з 29 краін. «БелАгра» выйдзе за межы гандлёва-лагістычнага цэнтра: да галоўнай пляцоўкі далучаныя эксперыментальныя палеткі, дзе вырошчваюцца азімыя пшаніца, жыта, ячмень і трыцікале.

Сярод навінак традыцыйнай выстаўкі ў гэтым годзе намеснік міністра таксама назваў уручэнне гран-пры пераможцу кожнай намінацыі — статуэткі «Багіня ўрадлівасці». Падчас конкурсаў на «БелАгра-2019» будуць вызначаныя найлепшы араты, чэмпіён смаку і найлепшая племянная карова малочнай пароды.

«Кожны павінен пастарацца выйсці на першае месца і атрымаць статуэтку, — заклікаў Уладзімір Гракун. — Традыцыя мусіць прыжыцца і стаць сімвалам выстаўкі».

На плошчы больш чым 75 тысяч квадратных метраў будуць прадстаўлены інавацыйныя распрацоўкі беларускіх вучоных. Прадэманструюцца і энергазберагальныя тэхналогіі, дзякуючы якім пры скарочаных выдатках можна атрымаць прыбаўленні ў вазе, удою ці ўраджайнасці.

Гэтым разам на выстаўцы будуць экспанавацца пладовыя і ягадныя культуры, а таксама ўсе калекцыі тэхнікі: глебаапрацоўчыя, пасяўныя, корманарыхтоўчыя, зернеўборачныя машыны, а яшчэ — рэтракамбайныды рэтратрактары. Прадэманструюць сваю сельгастэхніку не толькі беларускія вытворцы, але і прадстаўнікі Германіі, Чэхіі, Францыі, Славакіі, Турцыі, Італіі, ЗША, Канады. Увогуле, сёлета геаграфія выстаўкі пашырана аж да Ізраіля, Іспаніі, Нідэрландаў, Мазамбіка, Зімбабвэ.

Сёлета на выстаўку вяртаюцца вытворцы ўгнаенняў і сродкаў ахоывы раслін. Замежныя кампаніі нароўні з айчыннымі прадэманструюць магчымасці тэхнікі і прыклады перапрацоўкі прадукцыі — мясной, хлебабулачнай, кандытарскай. Акрамя таго, аграрыі прэзентуюць розныя пароды жывёлы, птушкі і рыбы. Дарэчы, у «рыбнай вёсцы» кожнаму наведвальніку выстаўкі прапануюць пакаштаваць не толькі юшку ад рыбгасаў, але і кансервы, вяленую і сушаную рыбу.

Як паведаміў **генеральны дырэктар міжнароднай выставачнай кампаніі ЗАТ «МінскЭкспа» Уладзімір БУЛАВІЦКІ,** на «БелАгра» будзе прадстаўлена больш як 320 адзінак тэхнікі і 94 прадпрыемствы з прадукцыяй перапрацоўкі, якія прапануюць дэгустацыю. Падчас выстаўкі адбудуцца дзелавыя сустрэчы, перагаворы і семінары. Адначасова з «БелАгра» пройдуць міжнародныя спецыялізаваныя выстаўкі «БелФерма» і «БелПрадукт».

Уладзімір Булавіцкі выказаў спадзяванне, што да 2021 года па загадзе Прэзідэнта краіны будзе створаны Нацыянальны выставачны цэнтр, які ўздыме правядзенне міжнароднага аграрнага форуму на новы ўзровень.

«Пакуль што мы вымушаныя штогод пачынаць з нуля. Нягледзячы на гэта, усе пытанні паспяхова вырашаюцца. «БелАгра» — галоўны праект нашай дзяржавы», — упэўнены кіраўнік «МінскЭкспа».

Для арганізатараў і ўдзельнікаў экспазіцыі мерапрыемства пачынаецца ўжо сёння: Уладзімір Булавіцкі паведаміў, што мантажныя работы і заезд экспанатаў стартуюць 31 мая. А наведвальнікаў чакаюць з 4 да 9 чэрвеня. Ад станцыі метро «Малінаўка» да экспазіцыі будзе курсіраваць бясплатны аўтобус. Можна дабрацца і транспартам ГЛЦ «Глобус Парк».

**Варвара МАРОЗАВА.**



Фота Анатоля КЛЕШЧУКА.

# Энергія смецця

*(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)*

— Пералічаныя магутнасці дазволяць вымаць да 10 тысяч тон другаснай сыравіны і выкарыстоўваць каля 50 тысяч тон раслінных адходаў, — заўважыла **Валянціна БАРКОЎСКАЯ, намеснік генеральнага дырэктара па добраўпарадкаванні, санітарным утрыманні жыллёвага фонду ДА «Мінская гарадская жыллёвая гаспадарка».** — Рост аб'ёмаў нарыхтоўкі ў межах праграмы «Камфортнае жыллё і спрыяльны асяродак» складзе чатыры тысячы тон другасных матэрыяльных рэсурсаў (ДМР), што ў суме дазволіць павялічыць масу паўторнага выкарыстання ЦКА да 265 тысяч тон у год, або да 30,8 %.

Павялічыць аб'ёмы другаснай сыравіны можна за кошт смеццесартавання, што дадаткова прынясе каля 20—25 тысяч тон ДМР у год, а смеццеперапрацоўка дадасць яшчэ 27—40 тысяч тон, мяркуе спецыяліст:

— Тэхналогія смеццеперапрацоўкі забяспечвае максімальна магчымае памяншэнне аб'ёмаў захавання адходаў, а ў шэрагу выпадкаў — выманне другаснай сыравіны з адходаў для ўцягнення яго ў гаспадарчы абарот на перапрацоўчых прадпрыемствах краіны. Паспрыяе гэтаму і будаўніцтва смеццеспальвальнага завода (2001—2025 гады ). Такім чынам, паралельна з развіццём сартавальных магутнасцяў і раздзельным зборам адходаў прапрацоўваецца пытанне перапрацоўкі ЦКА, што ўключае ў сябе выманне ДМР і ўтылізацыю той часткі адходаў, што застаецца пасля гэтага. Гэта дазволіць значна паменшыць аб'ём смецця, які захоўваецца на палігонах, і атрымаць дадатковую электра- і цеплаэнергію.

## Больш каляровых, менш сеткавых

Цяпер у Мінску выкарыстоўваецца каля 9000 кантэйнераў, якія знаходзяцца ў жылых дварах, на прыпынках, у рэкрэацыйных зонах, каля адміністрацыйных будынкаў. Пакрысе ад старых сеткавых кантэйнераў для раздзельнага збору смецця пазбаўляюцца, замяняючы іх на сучасныя еўракантэйнеры.

Па два новыя кантэйнеры атрымаюць і ўласнікі гарадскіх сядзіб.

— Будзе закуплена больш за 12 тысяч кантэйнераў для прыватнага сектара, каб бясплатна перадаць іх жыхарам, — расказаў **Віталь ВАЛЧЭЦКІ, намеснік дырэктара па вытворчасці і развіцці КУП «Спецкамунаўтатранс».** — Гэта будуць сметніцы аб'ёмам па 120 літраў для агульнага смецця і для другаснай сыравіны.

Разам з тым інфраструктура для раздзельнага збору камунальных адходаў смецця ў сталіцы развіта недастаткова, упэўнена **Ніна КУЛЬБЕДА, галоўны спецыяліст па інфармацыйнай рабоце дзяржаўнай установы «Аператар другасных матэрыяльных рэсурсаў»:**

— На большай частцы тэрыторыі яна нязручная для жыхароў. Горад недастаткова аснашчаны кантэйнерамі для збору шкла, паперы, пластыку. На мностве пляцовак няма поўнага камплекту кантэйнераў. Усе пляцоўкі неабходна ўкамплектаваць тымі тыпамі кантэйнераў, якіх не хапае, а на самой пляцоўцы — размясціць інфармацыю, што і яе неабходна выкідваць. І гэта датычыцца не толькі другаснай сыравіны, але і будаўнічых адходаў, буйнагабарытнага смецця і раслінных адходаў. Менавіта па выглядзе кантэйнерных пляцовак усе мы робім выснову, што далей адбываецца з адходамі: ці сапраўды яны ідуць на перапрацоўку, ці адпраўляюцца на палігоны.

Нягледзячы на значныя аб'ёмы збору ДМР, тэмпы яго павелічэння не вельмі значныя. Сталіца ў гэтым плане ў параўнанні з мінулым годам на апошнім месцы. Ды і па ўсёй краіне колькасць збору другаснай сыравіны павялічылася толькі на 9 %, так што справы яшчэ хапае. І пачынаць работу трэба кожнаму з сябе.

**Ірына СІДАРОК, фота аўтара.**




● **Тым часам**

# ГОМЕЛЬСКІ КАМПОСТ І «ЗЯЛЁНЫЯ» АДХОДЫ

**Гомельская жыллёвая гаспадарка ў пытаннях раздзельнага збору смецця заўжды была ў перадавіках краіны. Ад смеццеправодаў тут пазбавіліся яшчэ гадоў 15 таму. Маладое пакаленне нават не ведае, што гэта было за абсталяванне такое. А з восені мінулага года ў Гомелі пачала працаваць адкрытая пляцоўка для кампаставання.**

Яшчэ адно новаўвядзенне запрацуе літаральна з заўтрашняга дня. Згодна са схемай абарачэння з адходамі г. Гомеля, у прыватным сектары (а гэта 28 тысяч землеўладанняў) падзеляць біялагічныя адходы на два патокі. Траву, лісце, бацвінне і іншую зеляніну з падворкаў будуць забіраць асобна і складваць у бурты на пляцоўцы для кампаставання. Сюды ж будзе дадавацца лісце з гарадскіх дрэў, расказаў **Валерый ТКАЧОЎ, дырэктар гомельскага Спецкамунаўтатранса:**

— Атрыманы кампост пасля саспявання паспрабуем выкарыстоўваць у гарадской гаспадарцы. Забіраць смецце з падворкаў будзем, як і раней: з мяхоў, вёдзер ці іншых ёмістасцяў, куды людзі складуць «зялёныя» адходы. Раней мы вывозілі і смецце, і зеляніну ў адным патоку. Цяпер раз на тыдзень будзем вывозіць смецце, раз — біялагічную фракцыю. Павінна атрымацца. Хоць, людзі, вядома, пакуль не прывыклі, будуць супраціўляцца, але ж рабіць трэба. Калі ідзеш першы, напрацоўваеш вопыт, гэта заўжды цяжка. Смеццеправоды таксама няпроста закрываліся, былі свае праблемы.

Згодна з тэхналогіяй, якая выкарыстана на пляцоўцы для кампаставання, першая сыравіна саспее тут толькі ў лістападзе (праз год пасля закладкі). Валерый Ткачоў тлумачыць, што выбіралі найменш затратны варыянт, каб не трэба было рабіць страхунавес і бетанаваць дно:

— Падмурак нашай пляцоўкі зроблены з асфальтаграпуляту і знаходзіцца пад адкрытым небам. Першыя бурты мы закладвалі разам з біялагічнымі фракцыямі пасля сепаратара, так што сыравіна з іх пойдзе ўвосень толькі на перасыпку смецця на палігонах.

Жыхарам прыватных падворкаў некаторых магістральных вуліц Гомеля, дарэчы, ужо выдалі пластыкавыя чорныя кантэйнеры для звычайных адходаў і жоўтыя — для другаснай сыравіны. 700 штук з іх аплаціў аператар, столькі ж — гомельская гаспадарка.

— Многія з тых, хто атрымаў кантэйнеры пад адказнае захаванне, па-ранейшаму выстаўляюць смецце ў пакетах, бо хваляюцца, што кантэйнер скрадуць, — дзеліцца дырэктар Спецкамунтранса. — Аднак з 1 чэрвеня мы ўжо не будзем прымаць смецце ў пакетах з тых двароў, дзе ёсць кантэйнеры. За парушэнні людзей чакае пратакол і штраф ад 5 да 50 базавых велічынь.

# Валанцёры будуць гатовыя дапамагчы кожнаму

## У тым ліку балельшчыкам з дадатковымі патрэбамі — для гэтага валанцёры прайшлі спецыяльнае навучанне

**Работа па аказанні дапамогі менавіта гэтай катэгорыі балельшчыкаў — адна з найбольш складаных сярод той, якую трэба будзе выканаць валанцёрам на мультыспартыўным форуме, які мае адбыцца. Намеснік дырэктара фонду «Дырэкцыя II Еўрапейскіх гульняў 2019 года» Аркадзь МАЛЕЕЎ адзначыў, што з улікам міжнароднага вопыту арганізатары форуму загадзя распрацавалі і прапанавалі балельшчыкам з дадатковымі патрэбамі зручныя маршруты перамяшчэння, пачынаючы ад уваахода на спартыўныя аб'екты. Створана безбар'ернае асяроддзе для дадзеных груп, якое дазваляе хутка заняць свае месцы без дадатковых выдаткаў і намаганняў.**

*«Пры куплі білета праз інтэрнэт балельшчык з інваліднасцю адразу ж можа напісаць у спецыяльным полі праграмы неабходнасць суправаджэння непасрэдна на спартыўным аб'екце, адзначыць патрэбу ў паркоўцы,* — расказвае Аркадзь Малееў. — *Скажу, што кантакт з гэтымі балельшчыкамі адбываецца па тэлефоне або праз электронную пошту да таго, як яны прыбудуць да месца правядзення спаборніцтваў. Комплекс такіх мер накіраваны на тое, каб людзі засталіся задаволеныя атмасферай Гульняў, змаглі правесці тут час з задавальненнем і добра адпачыць»,* — расказаў Аркадзь Малееў.

На вучэбна-метадычным зборы для валанцёраў кампетэнтныя спецыялісты на працягу некалькіх гадзін на практыкы навучалі прысутных, як пры неабходнасці дапамагаць людзям з парушэннямі апорна-рухальнага апарату, слыху, зроку, якія карыстаюцца калясніцамі або іншымі сродкамі руху. Асобны тэматычны блок быў прысвечаны садзейнічанню ў арыентаванні на аб'ектах.

**Начальнік аддзела сэрвісаў для гледачоў кіравання бяспекі фонду «Дырэкцыя II Еўрапейскіх гульняў 2019 года» Аляксандр ПРАХАРЭНКА** адзначыў:

— *У ходзе мерапрыемства валанцёры сэрвісаў для гледачоў набылі неабходныя веды і навыкі па аказанні дапамогі людзям з дадатковымі патрэбамі. Такое навучанне дазволіць ім правільна і карэктна мець зносіны з такімі людзьмі, а таксама аператыўна рэагаваць на сітуацыі, у якіх патрабуецца садзейнічанне. Асноўная ўвага падчас трэнінгу ўдзелена канкрэтным сітуацыям, якія могуць паўстаць, каб надалей у ходзе правядзення Гульняў можна было дзейнічаць прадумана і зладжана.*

**Дырэктар ППУ «Офіс па правах людзей з інваліднасцю» Сяргей ДРАЗДОЎСКІ** дадаў, што мерапрыемства сапраўды аказалася вельмі патрэбнае. *«Наша арганізацыя займае прынцыповую пазіцыю, што любая спартыўная або турыстычная падзея павінна быць даступная для людзей з інваліднасцю. Мы ўжо распачалі пэўныя дзеянні, вынеслі шэраг прапаноў, як палепшыць элементы гарадской інфраструктуры ў сувязі з надыходзячымі Гульнямі. Вельмі важна, каб валанцёры былі гатовыя аказаць перш за ўсё інфармацыйную падтрымку, а пры неабходнасці прапанаваць спосаб рашэння той ці іншай праблемы».*

**Дар'я ЛАБАЖЭВІЧ.**

Мяняем звычкі

# Новае жыццё без тытуню

## Колькі трэба пратрымацца, калі кідаеш курыць

**Больш за два мільёны жыхароў Беларусі з'яўляюцца курыльшчыкамі. Паводле прагнозаў Сусветнай арганізацыі аховы здароўя, кожны другі з іх памрэ ад захворванняў, звязаных з гэтай шкоднай звычкай.**



— З 300 смерцяў, якія штодзень рэгіструюцца ў Беларусі, 14 % адбываюцца па прычыне захворванняў, выкліканых уплывам тытуню, — расказвае **каардынатар праграм па грамадскай ахове здароўя краінавага офіса Сусветнай арганізацыі аховы здароўя Валянцін РУСОВІЧ.** — Гэта значыць, штодзень ад такіх хвароб памірае каля 40 чалавек. На першым месцы — сардэчна-сасудзістыя захворванні, у прыватнасці інфаркты і інсульты. На другім — анкалагічныя. Курэнне з'яўляецца прычынай не толькі раку лёгкіх, але і раку мачавога пузыра, прамой кішкі, прастаты, стрававода — усяго 28 лакалізацый. На трэцім месцы — хранічная абструктыўная хвароба лёгкіх.

Як адзначае Валянцін Русовіч, кожную смерць ва ўзросце менш за 70 гадоў Сусветная арганізацыя аховы здароўя лічыць заўчаснай. У Беларусі сярэдняя працягласць жыцця мужчын — 69 гадоў. Таму лічыцца, што ў Беларусі мужчыны паміраюць заўчасна.

Паводле даследавання STEPS, у нашай краіне курыць больш за 48 % мужчын. Гэта шосты паказчык сярод краін еўрапейскага рэгіёну Сусветнай арганізацыі аховы здароўя. А вось беларускі курыць значна менш — жанчын з залежнасцю ад тытуню каля 12 %. І хоць гэта лічба з 1995 года вырасла амаль у тры разы, паказчык трымаецца на ўзроўні сярэднееўрапейскага. Распаўсюджаным застаецца курэнне і сярод моладзі. Паводле даследаванняў, у Беларусі курыць каля 50 тысяч падлеткаў, палова з іх набывае цыгарэты штодзень. Узрост пачатку курэння ў хлопцаў у сярэднім складае 16 гадоў, у дзяўчат — 17.

Паводле ацэнак Сусветнай арганізацыі аховы здароўя, кожная дзясятая смерць адбываецца ад захворванняў, выкліканых тытунём, — ад пасіўнага курэння, калі чалавек знаходзіцца ў памяшканні, дзе кураць іншыя. Напрыклад, за працоўную змену персанал кафэ, дзе дазволена курыць, атрымлівае дозу нікаціну, якая ўтрымліваецца ў сямі цыгарэтах. Дзеці, нават калі бацькі кураць не ў іх прысутнасці, таксама пакутуюць ад прадуктаў паўраспаду тытунёвага дыму, якімі напаўняецца адзенне, дываны, шторы і іншыя прадметы інтэр'ера. Яны ў некалькі разоў часцей хварэюць на рэспіраторныя хваробы — бранхіт, бранхіяльную астму, вострыя сярэдні атыт, пнеўманію.

У нашай краіне з 27 ліпеня, згодна з адпаведным антытытунёвым дэкрэтам, які падпісаў Прэзідэнт, будзе забаронена курэнне ва ўсіх цягніках, кафэ і рэстаранах, ліфтах, аўтамабілях падчас перавозкі ў іх дзяцей да 14 гадоў, дзіцячых пляцоўках і інш. Валянцін Русовіч падкрэсліў, што гэта добрая мера, якая дазволіць знізіць колькасць курыльшчыкаў. Сярод такіх жа дзейсных метадаў ён назваў павышэнне акцызаў на цыгарэты. Сёння ў кошце пачка цыгарэт акцыз складае 34,5 %, плануецца паступова павышаць яго да 75 %.

У шкале ўсіх псіхаактыўных рэчываў тытунь знаходзіцца ў сярэдзіне, адзначае **вядучы навуковы супрацоўнік аддзела наркалогіі РНПЦ псіхічнага здароўя Інэса ГРЫГОР'ЕВА.** Гэта значыць, што прывыканне да яго адбываецца вельмі хутка — з 1-2 разоў.

— Дзень без тытуню нездарма прызначаны на апошні дзень вясны. Гэта выдатная магчымасць адмовіцца ад курэння напярэдадні летняга адпачынку і змены абстаноўкі. Варта кінуць і патрываць два тыдні, калі ў вас будуць сімптомы, якія трэба пераадолець, — раіць Валянцін Русовіч. — На працягу трох тыдняў у крыві ўжо не застанецца нікаціну, праз шэсць месяцаў змены ў арганізме будуць устойлівымі. Канчаткова ўдаецца кінуць курыць звычайна з 2-3-й спробы.

**Алена КРАВЕЦ.**

# ШТО Ў СВЕЦЕ РОБІЦЦА

## У Ізраілі прызначаны паўторныя парламенцкія выбары



Кнэсет (парламент Ізраіля) зацвердзіў у другім і трэцім чытаннях закон аб самароспуску і прызначыў першыя ў гісторыі Ізраіля паўторныя парламенцкія выбары на 17 верасня, паведаміў па выніках галасавання спікер ізраільскага парламента Юлій Эдэльштэйн. Апоўначы 29 мая скончыўся 42-дзённы тэрмін, адведзены законам прэм'еру на фарміраванне новай урадавай кааліцыі па выніках выбараў 9 красавіка. Нетаньяху не ўдалося дамовіцца аб стварэнні кааліцыі з правых і рэлігійных партый, якія атрымалі 65 з 120 месцаў у Кнэсеце. Перамовы па пошуку кампрамісу, які дазволіў бы прэм'еру сфарміраваць урадавую кааліцыю, завяршыліся менш чым за гадзіну да галасавання па законе аб роспуску Кнэсета. Ізраільскае дзяржаўнае радыё Кап паведамляла, што Нетаньяху у сераду ўвечары зрабіў «апошнюю прапанову» аб кампрамісе паміж партыяй рускамоўных ізраільцян «Наш дом — Ізраіль» на чале з былым міністрам абароны Авігдорам Ліберманам і двума ўльтрарэлігійнымі партыямі ШАС і «Яхадут ха-Тора» па зацвярджэнні законапраекта аб прызыве артадаксальных яўрэяў у ізраільскую армію.

## У цэнтры Будапешта затануў катар з паўднёвакарэйскімі турыстамі

У выніку сутыкнення прагулачнага катара «Русалка» з круізным цеплаходам «Вікінг» на рацэ Дунай у Будапешце загінулі па меншай меры сем чалавек. Пра гэта паведаміла інфармагенцтва Reuters. Па звестках паліцыі, на борце знаходзіліся 33 турысты з Паўднёвай Карэі і двое членаў экіпажа. Сем чалавек удалося выратаваць, яшчэ 21 прапаў без вестак. Паўднёвакарэйскае міністэрства замежных спраў пацвердзіла гібель сваіх грамадзян, паведамляе «Інтэрфакс». Аварыя адбылася насупраць будынка венгерскага парламента. Момант сутыкнення зняслі камеры відэаназірання. Прадстаўнік экстранных службаў Габар Чата заявіў, што «многія пацярпелыя знаходзіліся ў крытычным стане».



Тэмпература вады ў Дунаі цяпер не перавышае 10 градусаў. Выратавальная аперацыя ўскладнялася дрэннымі ўмовамі надвор'я і моцным цячэннем. Патанулы катар знойдзены ў раёне моста Маргарыта. Па паведамленні агенцтва «Рёнхап», турысты з Паўднёвай Карэі ўдзельнічалі ў турнэ па шасці краінах Усходняй Еўропы.

## У ЗША ўрачы змаглі выхадзіць немаўля вагой 245 грамаў



Самае маленькае дзіця з'явілася на свет у снежні мінулага года ў клініцы, размешчанай у амерыканскім горадзе Сан-Дыега. Яго маці знаходзілася на 23-м тыдні цяжарнасці. Роды ў жанчыны былі выкліканыя штучна: урачы выявілі, што з-за сур'ёзных ускладненняў, якія ўзніклі ў ходзе цяжарнасці, плод перастаў расці. Па словах спецыялістаў, нованароджаная была памерам з вялікі яблык. Дзяўчынку змясцілі ў спецыяльны інкубатар, дзе яна на працягу пяці месяцаў знаходзілася пад няспынным наглядам урачоў. Медыкі змаглі выхадзіць самую маленькую нованароджаную ў свеце, з аддзялення інтэнсіўнай тэрапіі яна вярнулася ў сям'ю да бацькоў. Яе вага цяпер складае 2,2 кілаграма. Як вядома, сёлета ў лютым японскія ўрачы змаглі выхадзіць хлопчыка, які з'явіўся на свет з вагой 268 грамаў, яго называлі самым маленькім нованароджаным. Спецыялісты тады адзначалі, што ў свеце зарэгістравана ўсяго 23 выпадкі, калі выжывалі дзеці, якія з'явіліся на свет з вагой менш чым 300 грамаў.

Ну і ну!

# Выявіўся нонсэнс: махінацыі з сеткамі

**Махінацыі з сеткамі выявілі дзяржінспектары Віцебскай абласной інспекцыі пры праверцы дакументаў прадпрыемства-арандатара з Полацкага раёна. У арэндзе ў яго — два буйныя возеры на поўдні раёна. На адным з іх прамысловая брыгада лавіла вугра. Машыну, на якой звеннявы брыгады перавозіў улоў (43 кілаграмы), спынілі інспектары. Аказалася, што з чатырох асобнікаў накладной на перавозку рыбы аформлены толькі першы, і тое часткова.**

У ходзе разбору «ўсплылі» нетыпавыя дакументы: высветлілася, што сеткі і нерат, якімі прамысловыя брыгады ловяць рыбу, не належаць прадпрыемству-арандатару. Іх уладальнікамі былі самі рыбакі. Яны, паводле дагавораў, падпісаных з былым дырэктарам прадпрыемства, перадалі свае прылады ў бязвыплатнае карыстанне для свайго працадаўцы. З юрыдычнага пункту гледжання такі дагавор — нонсэнс, бо работнікі арандатара нароўні з іншымі грамадзянамі не маюць права валодаць сеткамі і захоўваць іх у сябе дома.

Больш за тое, каб атрымаць маркіровачныя знакі, якімі абавязкова павінны пазначацца сеткі арандатараў, ранейшы дырэктар прадпрыемства падаў у Полацкую інспекцыю дакумент, што яны стаяць на балансе арганізацыі. Як аказалася, гэта не так. Былому кіраўніку пагражае крымінальная адказнасць.

Затрыманы з вугром звеннявы прызнаўся, што ў кватэры яго сваячкі ў пасёлку Ушачы захоўваецца 38 прамаркіраваных і 97 немаркіраваных сетак ды 11 нератаў. Прылады канфіскавалі, у дачыненні да рыбака складзены пратакол. Агульная даўжыня сетак была больш чым 9 кіламетраў, многія ўнікальныя: дасягаюць у вышыню 10—12 метраў. Паводле папярэдняй ацэнкі, усе гэтыя прылады каштуюць не менш як 20 тысяч рублёў.

Для паўнаты карціны дзяржінспектары вырашылі праверыць яшчэ двух рыбакоў, якія ўжо не працавалі на арандатара, але некалі таксама перадавалі прадпрыемству ў карыстанне свае сеткі. У аднаго з іх падчас вобыску канфіскавалі 126 сетак даўжынёй каля 8 кіламетраў і 11 нератаў, за іх захоўванне мужчыну будзе прызначаны штраф. Іншы выдаў добраахвотна 14 сетак даўжынёй каля аднаго кіламетра і нерат. Не чакаючы праверкі і штрафу, яшчэ адзін былы работнік сам патэлефанаваў у інспекцыю і здаў 30 сетак даўжынёй 1,5 кіламетра.

**Сяргей РАСОЛЬКА.**

Стыхія

## Наляцелі вецер з дажджом...

**Паводле аператыўных звестак, з прычыны праходжання навальнічнага фронту з парывамі ветру (да 13 м/с) і дажджу ў сераду зафіксаваны адзін выпадак пашкоджання даху будынка ў Мінску, два выпадкі разбурэнняў дарожнага пакрыцця ў Валожынскім раёне і 11 выпадкаў падзення дрэў (шэсць у сталіцы і пяць — у Віцебскай вобласці), у выніку якіх пашкоджаны сем легкавых аўтамабіляў.**

Так, па інфармацыі МНС, у Мінску па вуліцы Баграціёна, 51 у выніку парываў ветру быў пашкоджаны дах будынка царквы «Гефсіманія». А ў раёне сталічнай Запарожскай плошчы сарвала частку канструкцыі даху прыватнага жылога дома. З-за моцных парываў ветру яна апынулася на праезнай частцы. Пашкоджаны тры аўтамабілі, ніхто не пацярпеў. У выніку ападкаў (з 17.30 да 18.30 выпала 20 мм пры сярэднямесячнай норме 65 мм) у Мінску былі падтоплены пяць участкаў дарог, адбылося прыпыненне руху (да 56 хвілін) 19 тралейбусных маршрутаў.



У выніку дажджу (з 15.00 да 18.00 выпала 18 мм пры сярэднямесячнай норме 64 мм) адбыліся падмыў грунту і разбурэнні участкаў (15х30 м) асфальтавай дарогі Р-54 паміж вёскамі Пяршаі Скрундзяўшчызна і (10х20 м) асфальтавай дарогі ў вёсцы Пяршаі Валожынскага раёна. Пацярпелых няма. Жыццезабеспячэнне насельніцтва не было парушана. Работнікамі МНС і іншых арганізацый праводзіліся работы па адпампоўванні вады, распілоўцы і ўборцы дрэў, якія ўпалі.

**Сяргей РАСОЛЬКА.**


Наступствы стыхіі ў Валожынскім раёне.

Надвор'е

## У першыя дні лета — да +27 і вышэй

**У выхадныя ў нашай краіне месцамі пройдуць кароткачасовыя дажджы, паведамілі спецыялісты Рэспубліканскага цэнтра па гідраметэаралогіі, кантролі радыеактыўнага забруджвання і маніторынгу навакольнага асяроддзя Мінпрыроды.**

Як адзначылі ў Белгідрамеце, колькасць ападкаў у большасці рэгіёнаў у маі адпавядала сярэднім шматгадовым значэнням, але ёсць раёны на поўдні краіны, дзе выпалі амаль тры месячныя нормы ападкаў. У рэкардсменах Лунінецкі раён. Апошні майскі дзень, па звестках сіноптыкаў, у асноўным будзе вызначаць вобласць павышанага атмасфернага ціску, сфарміраваная ў халоднай паветранай масе, толькі ў крайніх паўднёва-ўсходніх раёнах краіны захаваецца ўплыў атмасфернага фронту. Там, па паўднёвым усходзе Гомельскай і Магілёўскай абласцей, прагназуюцца кароткачасовыя дажджы, магчымыя навальніцы.

У першы дзень каляндарнага лета надвор'е ўначы ў асноўным будзе вызначаць вобласць павышанага атмасфернага ціску, раніцай і ўдзень адаб'ецца ўплыў малаактыўнага франтальнага падзелу, які насоўваецца з боку Балтыкі. Таму ўжо ў суботу чакаецца пераменная воблачнасць, а ўначы ў паўночных раёнах, удзень месцамі па краіне пройдуць кароткачасовыя дажджы, магчымыя навальніцы. Тэмпература паветра ўначы складзе ад плюс 8 да плюс 14 градусаў, удзень — 19—25 цяпла, па паўднёвым усходзе краіны паветра прагрэецца да плюс 27 градусаў. У нядзелю адаб'ецца ўплыў малаактыўнага атмасфернага фронту, які перамяшчаецца ва ўсходнім кірунку. Таму месцамі па краіне пройдуць кароткачасовыя дажджы, удзень у некаторых раёнах з навальніцамі. Тэмпература паветра ўначы складзе 9—15 цяпла, удзень — ад плюс 20 да плюс 27 градусаў.

Паводле папярэдніх прагнозаў айчынных сіноптыкаў, у пачатку наступнага тыдня ў нашай краіне захаваецца цёплае надвор'е, у многіх рэгіёнах ападкаў не будзе. У панядзелак уначы тэмпература паветра складзе 7—14 цяпла, удзень — ад плюс 20 да плюс 26 градусаў, па поўдні краіны паветра прагрэецца да 28 градусаў.

**Сяргей КУРКАЧ.**

# ЛЯМУСЫ-ДВАЙНІКІ?

## ЛЯМУС ДРАЎЛЯНЫ

Гэта наогул унікальны аб'ект, адзіны такога кшталту ў Беларусі. Дакладна вядома, што ён пабудаваны без адзінага цвіка. І ўсё ж падчас рэканструкцыі іх было выцягнута каля 12 кілаграмаў. Такі адбітак пакінуў час, але не толькі цвікі. Тут жылі людзі, яны перабудоўвалі лямус на свой лад, было шмат перагародак, змяняліся памеры вокнаў, выразаліся дзверы, рабіліся печкі. Кажуць, што апошнія жыхары пакінулі будынак толькі ў васьмідзясятых гадах мінулага стагоддзя. Зараз яго даводзяць да аўтэнтычнага стану.

Заходзім на тэрыторыю кляштара з **прадстаўніком інфармацыйна-турыстычнага цэнтра Гродзенскай каталіцкай епархіі Гражынай ШАЛКЕВІЧ.**

— Зараз гэта будаўнічая пляцоўка, але мясцовыя ўлады пайшлі нам насустрач і дазволілі пускаць турыстаў, якія імкнуцца дакрануцца да старажытнага дрэва. Адзінае абмежаванне — нельга ўваходзіць у памяшканне, — папярэджвае Гражына Шалкевіч. — А экскурсій зараз даволі шмат, бывае, што і для аднаго-двух чалавек правожу.

Інтарэс да гісторыі самага старажытнага драўлянага будынка Беларусі расце. Ім цікавяцца не толькі замежныя турысты, але і гродзенцы. Многія да гэтага часу не здагадваліся, які ўнікальны аб'ект схаваны за высокай каменнай агароджай Брыгіцкага касцёла. Праўда, епархія ён быў перададзены толькі 15 гадоў таму, а да гэтага часу ў манастырскім комплексе месціўся псіха-неўралагічны дыспансер. Зразумела, што экскурсіі сюды ніхто не вадзіў. І толькі некалькі гадоў таму, пасля звароту гродзенскіх гісторыкаў, пачаўся этап рэнесанса. Да рэстаўрацыі лямуса далучылася Міністэрства культуры і нацыянальнай спадчыны Польшчы, якое ўзяло на сябе фінансаванне ўзнаўленчых работ. Задзейнічаны спецыялісты з абодвух бакоў.

— Гэтыя сцены многае тояць — за некалькі стагоддзяў адбылося шмат падзей. Горад і гарэў не аднойчы, і вайна не адна праз яго прайшла, а драўляны будынак выстаяў. Каб яго захаваць, вядуцца вельмі грунтоўныя работы. Зараз пачаўся чарговы, чацвёрты этап рэстаўрацыі, — паведаміла прадстаўніца епархіі.


Самы старажытны ў Беларусі драўляны будынак.

Яна расказала, што ўжо зроблена. Самы адказны этап быў, калі паднімалі будынак, каб выраўняць сцены. Пакуль ён вісеў, змянілі вянцы, якія прагнілі, і ўмацавалі фундамент. Потым паставілі будынак на месца. Трэба было зрабіць шмат падлікаў, каб ён не склаўся, як картачны домік. Але ўсё абышлося. Затым уручную ачысцілі сцены і насыцілі спецыяльным растворам ад шкоднікаў — іх сляды даволі відавочныя на дрэве.

З'явіўся новы дах з гонты — пласцінкі зроблены з асінавага дрэва, якое праз некалькі гадоў зменіць колер. «Будзе, як на старых фотаздымках», — удакладняе Гражына Шалкевіч.

Аб перыядзе пабудовы лямуса ідуць спрэчкі. Некаторыя называюць 1634 год, калі ў горад прыехалі першыя сёстры-брыгіткі. Але больш імаверным лічыцца 1769 год. Лямус — нямецкае слова, якое азначае гаспадарчую пабудову. Такой яна і была ў той час. Тут захоўвалі прадукты, гародніну, прылады працы. Але не толькі. На другім паверсе жыў капелан — духаўнік сёстраў. Дарэчы, узрост лямуса могуць падказаць бярвенні. Польскія спецыялісты ўзялі пробы і праводзяць спецыяльны аналіз, які дасць дакладны адказ, калі ён пабудаваны.

Калі лямус пройдзе рэстаўрацыю, тут размесціцца выставачная экспазіцыя, прысвечаная сёстрам-брыгіткам. Напачатку планавалася зрабіць епархіяльны музей і размясціць экспанаты з падвалаў касцёла. Аднак цяжка стварыць умовы для іх захавання, таму прынялі рашэнне адвесці пад мастацкую галерэю крыло кляштара, — патлумачыла прадстаўніца епархіі.

Калі завершыцца рэстаўрацыя, тут не бяруцца сказаць, бо сродкі паступаюць паэтапна. Да таго ж працэс даволі марудны і далікатны, бо аб'ект каштоўны ў гістарычным сэнсе, нездарма яму прысвоена катэгорыя 0. Гэта значыць, што будынак з'яўляецца аб'ектам культурнай спадчыны і можа быць унесены ў спісы ЮНЕСКА.

## ЛЯМУС ЦАГЛЯНЫ

І такі таксама ёсць у Гродне. Гэта былы склад у гарадскім старажытным комплексе «Гарадніца». Ён захаваўся з часоў віцэ-адміністратара горада, а працей, яго старасты, Антонія Тызенгаўза. Гэты комплекс таксама вельмі значны ў гісторыі архітэктуры Беларусі, бо пабудаваны ў новых для тых часоў традыцыях — тыпавыя фасады, канструктыўныя рашэнні і г. д. Ад усяго комплексу ў Гродне захавалася шэсць будынкаў, у тым ліку цагляны лямус, які на плане горада 1823 года пазначаны як «цагляная крама пры канюшні».

Гістарычны будынак у свой час займалі вайскоўцы. У 20—30-я гады мінулага стагоддзя дом значыўся як акцёрскі. Пасля вайны гэта была сталоўка дзіцячага дома, з пяцідзясятых — жылы дом. Многія гродзенцы памятаюць, у якім непрывабным выглядзе стаяў будынак яшчэ гадоў дваццаць таму. Але знайшоўся бізнесмен, які яго выкупіў і адрамантаваў. Зараз тут месціцца рэстаран, які так і называецца — «Стары Лямус», а сам будынак удала ўпісваецца ў гістарычны цэнтр. Дарэчы, у горадзе яшчэ нямала занядбаных гістарычных будынкаў, і любая ініцыятыва ў гэтым кірунку для ўлад вельмі пажаданая.

**Маргарыта УШКЕВІЧ.**

*(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)*

Падзея

## «НАВІГАТАР» ДЛЯ МІНСКА

**У сталіцы ўстанавілі скульптуру работы ўраджэнца Віцебска Восіпа Цадкіна.**



У першы чацвер чэрвеня ў сталіцы ў новым скверы па вуліцы Прытыцкага, 60/2 адбудзецца ўрачыстая прэзентацыя скульптуры аднаго з найбуйнейшых прадстаўнікоў авангарднага мастацтва XX стагоддзя, ураджэнца Віцебска Восіпа Цадкіна. Манументальная бронзавая работа «Навігатар» ужо ўстаноўлена ў Парыжы каля выхада з Моста інвалідаў. Такім чынам, Мінск стаў другой еўрапейскай сталіцай, якая будзе ўпрыгожана скульптурай вялікага майстра.

Восіп Цадкін — адзін з яркіх прадстаўнікоў Парыжскай школы, ураджэнцаў Беларусі. Выбітны скульптар XX стагоддзя нарадзіўся 28 студзеня (9 лютага) 1888 года ў Віцебску. Творы Цадкіна прадстаўлены ў вядомых музейных і прыватных сходах розных краін свету. Па ініцыятыве аднаго камерцыйнага банка краіны работу Цадкіна было вырашана ўстанавіць у скверы каля галоўнага офіса Белгазпрамбанка.

— Гэта па-сапраўднаму знакавая падзея для нашай краіны, — падкрэсліў **старшыня праўлення Белгазпрамбанка Віктар БАБАРЫКА.** — Бо праект «Арт-Беларусь» першапачаткова задумваўся намі як наглядная ілюстрацыя ўкладу ураджэнцаў нашай краіны ў агульнасусветнае мастацтва. На працягу ўжо многіх гадоў Белгазпрамбанк займаецца вяртаннем культурных каштоўнасцяў у Беларусь, і нам вельмі прыемна падзяліцца гэтай выдатнай работай Цадкіна з Мінскам і мінчанамі. Мы хацелі не проста ўстанавіць скульптуру, але стварыць новую культурную прастору, якая вартая сталіцы еўрапейскай дзяржавы.

«Навігатар» — манументальная скульптура Восіпа Цадкіна. Першапачаткова створана з дрэва ў 1937 годзе. У цэнтры кампазіцыі — чалавек, у руках якога карабель — адзін з галоўных сімвалаў твора, адсылка да радзімы аўтара, да фамільнай справы яго сям'і — суднабудавання. У 1993 годзе гэтая ж статуя, але ўжо адлітая ў бронзе, была ўсталяваная ў 7-й акрузе Парыжа каля выхада з Моста інвалідаў. Белгазпрамбанк набыў адзін з асобнікаў «Навігатара» на нью-ёркскіх таргах аўкцыённага дома «Christie's», каб устанавіць яго каля будынка свайго галаўнога офіса.

**Сяргей КУРКАЧ.**

## «Белавія» адкрыла рэйсы ў Талін

**30 мая выканаааны першы такі рэйс па маршруце Мінск — Талін, паведаміла спецыяліст па сувязях з грамадскасцю ААТ «Белавія» Анастасія Навуменка.**

Палёты па маршруце Мінск — Талін — Мінск будуць адбывацца на рэгулярнай аснове чатыры разы на тыдзень з вылетам з нашай сталіцы ў 8.50 па панядзелках, чацвяргах і ў 15.50 па аўторках і суботах з прыбыццём у міжнародны аэрапорт Таліна імя Ленарта Меры. Зваротны рэйс будзе з вылетам у 10.45 па панядзелках, чацвяргах і ў 17.45 па аўторках і суботах з прылётам у Нацыянальны аэрапорт Мінск (час для ўсіх аэрапортаў указаны мясцовы). Кошт авіябілетаў у адзін бок складае ад 93 еўра з улікам таксаў і збораў, туды-назад — ад 178 еўра.

**Сяргей РАСОЛЬКА.**

Жыццёвінкі

# БЫВАЕ І ТАКОЕ

## ВЕДАЙ, З КІМ!

Міхась даўно скардзіўся дома і на працы — а робіць ён на заводзе фрэзероўшчыкам, — што нешта баліць іншы раз у грудзях — сцісне так, што не дыхнуць. Па настойлівай просьбе жонкі ён усё ж паказаўся кардыёлагу, той пакруціў галавой, здзіўляючыся, чаму пацыент раней не звярнуўся да яго, і адразу ж шпіталізаваў. Міхасю ж патлумачыў: «Без аперацыі, браток, ніяк: давядзецца памяняць клапан на штучны... Калі жыць хочаш...»

Хто ж не хоча! Яму ж толькі пяцьдзясят споўнілася. Сына выгадаваў, дрэва пасадзіў, і не адно. Дом, праўда, не пабудаваў, але нічога страшнага: зарабіў затое сумленнай працай двухпакаёўку, так што, можна сказаць, усе тры запаветы здзейсніў. А рыхтуючыся да аперацыі, прыгадаў свайго дзеда Мікалая, які ўжо ў глыбокай старасці казаў: «Хацелася б яшчэ хоць трошкі пажыць — каб глянуць, кім ты, Міхаська, станеш, якую жонку выбярэш, ці добрую і прыгожую....» Ён і паспеў гэта ўсё ўбачыць! Таму паспеў, відаць, што моцна хацеў.

Аперацыя прайшла паспяхова. Міхасю ж лечачы доктар сказаў, што трэба паступова рыхтаваць паперы на камісію, — пасля замены клапана павінны даць групу інваліднасці. Трэцюю ці другую, але абавязкова, бо ён пэўны час не зможа працаваць, а жыць жа неяк трэба. Падзяліўся гэтым з сябрам Алегам, які наведаў яго ў лячэбніцы.

— Слухай, Міхась, трэба доктару грошай даць, пажадана зялёненькіх, каб напісаў усё як мае быць! — загарэўся Алег. — Ад доктара многае залежыць.

— Я не змагу, — шчыра прызнаўся Міхась. — Сароменюся.

— Былі б грошы!

— Ды ёсць быццам...

— Колькі?

— Сто долараў!

— Хопіць! Давай іх мне, і ўсё будзе лепшым чынам!

— Але грошы дома. Добра, скажу Ніне, каб прынесла...

Назаўтра Алег, як і дамовіліся, забраў у Міхася сто долараў і адразу ж вышмыгнуў з палаты. Вярнуўся даволі хутка, задаволена пацёр далонямі: усё ў ажуры, сябра мой! Вось так працаваць трэба! Са мной не прападзеш!..

У той жа дзень здарылася бяда: перабягаючы дарогу ў недазволеным месцы, Алег трапіў пад машыну. З атрыманымі траўмамі яго даставілі ў бальніцу, і калі рабілі вопіс рэчаў і каштоўнасцяў, што былі пры ім, то ўнеслі ў той спіс і сто долараў...

## УРОК

Гэты мужчына даволі часта ездзіў у камандзіроўкі. Часцей за ўсё — у сталіцу. Каб паспець на цягнік, які ішоў даволі рана, ён, вядома ж, карыстаўся паслугамі таксі, бо жыў далёка ад вакзала. Заказваў адразу некалькі машын, і тая легкавушка, якая першай спынялася перад ягоным пад'ездам, адвозіла хітравана па прызначэнні. А што ж іншыя таксісты? Так, прыязджалі і яны, чакалі... але чакалі, як кажуць, каля мора пагоды. Так было некалькі разоў — якраз да таго часу, пакуль таксісты не пазнаёміліся паміж сабой бліжэй і не дамовіліся пакараць хітравана. Паставілі ў вядомасць дыспетчараў: так і так, маўляў, калі будзе гэты каварны тып заказваць таксі, не адпраўляйце, а яму ж паабяцайце: заказ прыняты, чакайце. Калі ён такі разумны, то і мы не дурні. Дыспетчары падтрымалі таксістаў.

І тую раніцу доўга чакаць не давялося. Мужчына выклікаў адразу чатыры таксі. А сам выглядаў у акно: няма пакуль. Добра — пачакаем. Пакуль час ёсць. Але крыху пазней пачынае непакоіцца і выходзіць на двор. Турбуе дыспетчараў. Даведаўшыся, на які адрас выклікалі таксі, тыя спакойна адказваюць: чакайце! Мужчына нервуецца яшчэ больш: колькі можна чакаць?! Як вы працуеце?! Дзе сумленне?! Я спазняюся! Вы мне адкажаце за маё спазненне! Абяцаю!..

А сам, нервова паглядаючы на гадзіннік, бяжыць на аўтобусны прыпынак, хоць і мала верыць, што паспее да адпраўкі цягніка.

Не ведаю, ці скардзіўся куды мужчына, але дакладна ведаю, што на цягнік ён спазніўся. Таксісты ж радаваліся, назіраючы, як той бегаў-лаяўся па вакзале: правучылі, нарэшце, хітравана, далі яму добры ўрок. Толькі вось цікава, ці засвоіць ён яго? Мо трэба будзе і паўтарыць калі?..

## ВЕНІК

У канцы мінулага года давялося амаль тыдзень жыць у Бабруйску. Мне падабаецца гэты горад, там у драматычным тэатры ставяцца спектаклі па маіх п'есах, два і сёння ў рэпертуары, і калі мяне запрасілі госцем на фестываль беларускай драматургіі, які праводзіцца традыцыйна, я, вядома ж, ахвотна пагадзіўся. Уражанняў ад фестывалю засталося шмат. Меў магчымасць бліжэй пазнаёміцца з тэатральным жыццём краіны. З акцёрамі, рэжысёрамі, драматургамі.

Учора быў апошні дзень фестывалю, закрыццё адбылося позна, таму давялося яшчэ адну ноч правесці ў гасцініцы «Турыст», а назаўтра раніцай дабірацца на вакзал на гарадскім транспарце. Мне параілі сесці на маршрутку, паказалі, дзе яна спыняецца. Так і зрабіў. І ўжо па дарозе звярнуў увагу, што ў куточку перад першымі сядзеннямі стаіць новенькі венік. Звычайны, соргавы, якім мы карыстаемся і які вырошчваюць і робяць — я гэта бачыў на свае вочы, — ва Узбекістане. Падумалася: бач ты, як гаспадар маршруткі сочыць за чысцінёй у салоне, нават венік возіць. Малайчына. А потым... Вадзіцель працягнуў рэшту чарговай пасажырцы, тая не ўтрымала яе ў руцэ, і капейкі рассыпаліся. Паспрабуй збяры іх цяпер. Але толькі не ў Бабруйску! Жанчына хуценька ўзяла венік і вымела капейкі з-пад сядзення на свабоднае месца, дзе і падабрала, а затым паставіла венік на ранейшае месца і моўчкі села.

Вось так!

## ГРУША

Няма вёскі, а груша-дзічка стаіць. На самым высокім месцы — на гары. Таму яе адусюль відаць. Як той маяк на марскім беразе ці востраве. Тут стаяла некалі хата майго прадзеда Івана Авакумавіча Тарасава. І быў, вядома ж, ягоны плац, які збягаў пад нахілам ледзьве не ад самай грушы да раўчука, па якім увесну з гуллівым клёкатам неслася з палёў вада ў нашу Гутлянку. На мясцовых могілках, дзе прадзед пахаваны ў далёкім цяпер ужо ад нас 1925 годзе, мы з братам на металічным крыжы прымацавалі медальён — каб ведалі, хто тут спачывае вечным сном. (Своечасова спахапіліся, бо неўзабаве не стала і апошняга нашага сваяка, які паказаў нам магілу прадзеда.)

Івана Авакумавіча не помніла нават мая маці. Бо калі ён памёр, ёй было ўсяго два гады. Расказвала толькі, што быццам успудзіўся конь, дзед стараўся яго суняць, але не змог — быў моцна пабіты, ад ран яго і не стала. Бальніц тады не было, а шаптухі не выратавалі.

Вось ён, прадзед, і вырасціў гэтую вялікую, падобную на цар-дуб, грушу-дзічку. Сёння мне нават цяжка ўявіць, што Іван Авакумавіч сваім дзецям, якія жылі самастойна, выдзяляў па пяць мяхоў груш. Палічыце ж яго дзяцей: сыны Якаў (мой дзед), Васіль, Фёдар, Андрэй, дочкі Прося і Матруна. Напэўна, і для сябе пакідаў пяць мяхоў. Памножце — 35! Не верыцца. Але я вырас сярод такіх людзей, якія не хлусілі самі і не вучылі гэтаму мяне.

Тады ж не было ў вяскоўцаў цукру, то грушы сушылі і ўсю зіму пілі кампот.

Дзякуй табе, груша, за клопат пра маіх незабыўных продкаў.

Смак тваіх груш ведаю і я. Спадзяюся, ты мяне яшчэ пачастуеш. І неадноймы.

## ПАРАДА

Амаль пяцьдзясят гадоў назад Васіль упершыню паехаў на Урал — запрасіў аднакурснік, з якім разам вучыліся ў Магілёўскім машынабудаўнічым інстытуце. «Я ў тваіх бацькоў гасцяваў, і не раз, давай і ты да мяне ў госці, а, дружа? Мае старыя будуць вельмі рады, бо пра Беларусь і беларусаў начуты шмат, ды самага добрага».

Васіль асабліва і не вагаўся, амаль адразу пагадзіўся. Тая першая паездка не стала для яго апошняй. Потым ён багата разоў яшчэ пабываў на Урале. Так-так: там ён сустрэў дзяўчыну, якую адразу пакахаў, а праз тры дні прапанаваў ёй: «Выходзь за мяне замуж». Яна адказала: «Я згодная!»

Сёлета ў Маскоўскім раёне каля 2,5 тысячы фізічных асоб падалі дэкларацыі для аплаты падаходнага падатку. Члены камісіі згадзіліся, што трэба разам з падатковай інспекцыяй параўнаць спісы плацельшчыкаў і незанятых у эканоміцы — клопату гэта не складзе, а людзям назаляць не давядзецца. Згадзіліся і з тым, што сама сістэма аднясення да ліку незанятых у эканоміцы патрабуе ўдасканалення.

Праведзеная «рэформа» павінна дапамагчы пазбегнуць памылковага налічэння залішніх сум за «камуналку» — уласнік жылля, незаняты ў эканоміцы, сёлета мусіць плаціць за гарачую ваду па поўным кошце.

### У іншым населеным пункце або краіне

Адна з заяўніц на пасяджэнні камісіі прадстаўляла інтарэсы цёткі, ўласніцы жылля, якая даглядае бабулю ў іншым населеным пункце. Папярэдне жыхарка раёна прадставіла доказы, на падставе якіх члены камісіі прызналі, што цётка знаходзіцца ў складаных жыццёвых абставінах, і вызвалілі яе ад абавязку аплачваць гарачую ваду па абгрунтаваным тарыфе.

Яшчэ адны заяўнікі на папярэднім пасяджэнні ўзнялі амаль аналагічную праблему: уласніца кватэры — іх дачка, якой яны ў свой час падаравалі жыллё, — стала пражываць у Канадзе, мае канадскае грамадзянства. А бацькі ў Беларусі атрымалі вялікі рахунак за «камуналку». Камісія зрабіла запыт у Міністэрства замежных спраў, вывучыла прадстаўленыя сужэнцамі дакументы — і на чарговым пасяджэнні камісіі заяўнікаў вызвалілі ад абавязку плаціць «па поўнай». Ва ўсіх выпадках будзе праведзены пераразлік.

### Хто ў рамеснікі, хто ў ЛПП...

Камісіі па каардынацыі работы па садзейнічанні занятасці насельніцтва з'явіліся летась на падставе Дэкрэта Прэзідэнта «Аб садзейнічанні занятасці насельніцтва». Тады ў параўнанні з першай рэдакцыяй Дэкрэта ад 2015 года змяніліся падставы для прылічэння да занятых або незанятых у эканоміцы.

Кожны беларус у службе «адно акно» свайго раёна можа атрымаць лагін і пароль ад базы даных, створанай Міністэрствам працы і сацыяльнай аховы, і самастойна сачыць за ўласным лёсам: якія меры садзейнічання аказаныя, якія рашэнні і на які перыяд прынятыя.

У снежні мінулага года ў базу трапілі 18 700 жыхароў Маскоўскага раёна. Зараз у спісе знаходзяцца 16 400. «Хтосьці ўжо прызнаны занятым, хтосьці прадставіў неабходныя дакументы. Напрыклад, нарадзілася дзіця за межамі краіны — звестак у загсе няма, бо пасведчанне аб нараджэнні выдаецца ў адзіным экземпляры. У такім выпадку ў Беларусі дзіця атрымлівае толькі пашпарт», — тлумачыць **сакратар камісіі Наталля ЖАРЫКАВА.**

У камісію звярнуліся больш за сем тысяч чалавек, па якіх у далейшым прынятыя рашэнні. Для садзейнічання занятасці бесперастанна праводзяцца спецыяльныя мерапрыемствы, працягваецца інфармаванне. Кожнаму з тых амаль 19 тысяч чалавек, што былі ў спісе ў мінулым снежні, дасланыя паведамленні і запрашэнні звяртацца да спецыялістаў.

«У некаторых выпадках Дэкрэт дапамог легалізаваць «цяньявы» бізнес — людзі пачалі афіцыйна афармляцца на работу. Гэта значыць, атрымалі сацыяльную абарону: і гарантыю пенсіі, і бальнічныя лісты, і адпачынкі», — звяртае ўвагу Наталля Жарыкава.

Сакратар камісіі нагадвае, што Дэкрэтам таксама спрошчаная сістэма развіцця ўласнага бізнесу без афармлення індывідуальнага прадпрымальніцтва. Камісія інфармуе грамадзян і пра гэтую магчымасць, дапамагае парадамі тым, хто жадае працаваць на сябе.

Бывае, праўда, і наадварот. Вось, расказвае Наталля Жарыкава, звярнулася на камісію жанчына: адзін сын п'е, другі, гледзячы на гэта, страціў псіхічнае здароўе. Маці прапанавалі разгледзець варыянт лячэбна-працоўнага прафілакторыя для сына-алкаголіка. Жанчына пры дапамозе органаў унутраных спраў падала дакументы ў суд на накіраванне сына ў ЛПП.

...Кожны панядзелак а 15-й гадзіне члены камісіі адміністрацыі Маскоўскага раёна сталіцы на падставе дакументаў вырашаюць, ці не знаходзіцца жыхар у цяжкіх жыццёвых абставінах, выпраўляюць звесткі пра тых, хто трапіў у спіс памылкова (напрыклад, ваенны пенсіянер). Як кажа сакратар камісіі, кожнага заяўніка можна зразумець: «База сфарміраваная. Мы імкнёмся максімальна апавясціць грамадзян, якія ў яе трапілі. Зразумела, пра кожнага з амаль дваццаці тысяч чалавек камісія не ў стане даведацца, ці працуе ён, дзе, як. Мы кажам: «Вы туды трапілі, давайце пойдзем адно аднаму насустрач і вырашым пытанне».

**Варвара МАРОЗАВА.**

### У тэму

**У заканадаўства аб незанятых у эканоміцы ўнесены змены**

Некаторыя змены закранулі Палажэнне аб парадку аднясення працаздольных грамадзян да незанятых у эканоміцы, фарміравання і вядзення базы даных працаздольных грамадзян, якія не занятыя ў эканоміцы, уключаючы ўзаемадзеянне ў гэтых мэтах дзяржаўных органаў і арганізацый. Адпаведныя навацыі замацаваны ў пастанове Саўміна ад 25 мая 2019 года № 333, апублікаванай на Нацыянальным прававым інтэрнэт-партале, паведамляе БелТА.

База незанятых у эканоміцы запушчана 1 снежня 2018 года. Грамадзяне, якія трапілі ў яе, аказваюцца ў полі зроку камісій па садзейнічанні занятасці насельніцтва. На аснове выяўнага прынцыпу ім пры неабходнасці аказваецца дапамога. Акрамя таго, тыя грамадзяне, якія застаюцца без работы без аб'ектыўных падстаў і пры гэтым маюць ва ўласнасці кватэры, з 1 студзеня гэтага года павінны аплачваць па поўных тарыфах гарачае водазабеспячэнне, а з 1 кастрычніка 2019 года будуць разлічвацца па эканамічна абгрунтаваных тарыфах і за газазабеспячэнне і цеплазабеспячэнне.

Згодна з дакументам, цяпер у базу не будуць уключаць сужэнцаў асоб, прызначаных на пасаду ў міждзяржаўныя органы (прадугледжаныя ў міжнародных дагаворах Беларусі альбо рашэннях адпаведных міжнародных органаў), а таксама сужэнцаў асоб, накіраваных на работу за мяжу ў якасці аташэ па пытаннях абароны пры пасольстве Беларусі ці яго памочніка.

Мясцовыя выканаўчыя і распарадчыя органы абавязалі забяспечыць узаемадзеянне ваенных камісарыятаў з пастаянна дзеючымі камісіямі па каардынацыі работы па садзейнічанні занятасці насельніцтва. Яны павінны перадаваць інфармацыю аб прызваных і адпраўленых на месца праходжання тэрміновай ваеннай службы, службы ў рэзерве. Па прызваных і адпраўленых у лютым — маі звесткі павінны перадавацца да 20 чэрвеня гэтага года, у жніўні — лістападзе — да 20 снежня 2019 года.

Акрамя таго, уведзена персанальная адказнасць за прадастаўленне дакладнай інфармацыі для фарміравання (актуалізацыі) базы даных. Яна ўскладзена на кіраўнікоў рэспубліканскіх органаў дзяржкіравання і іншых дзяржарганізацый, падпарадкаваных ураду, старшынь аблвыканкамаў і Мінгарвыканкама, а таксама кіраўнікоў іншых арганізацый, якія прадстаўляюць такую інфармацыю.

# НА МЕСЦЫ ДАПАМОГУЦЬ ПАДКАСАЦЬ РУКАВЫ

*(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар. «МС».)*

Колькасць вольных працоўных месцаў павялічылася ў 1,2 раза ў параўнанні з аналагічным перыядам 2018 года: узрос попыт на вакансіі, звязаныя з сезонным характарам працы — адкрываюцца атракцыёны ў парках культуры і адпачынку, летнія кавярні, тэрасы, кіёскі, павільёны, палаткі. Адпаведна ўзрастае патрэба ў кухарах, прадаўцах, кандытарах, барменах, касірах, дзяжурных атракцыёнаў і гульнявога абсталявання.

Адначасова расце попыт на працаўнікоў сельскай гаспадаркі і будаўніцтва. Запатрабаваныя трактарысты сельскагаспадарчай вытворчасці, муляры, абліцоўшчыкі, плітачнікі.

**Варвара МАРОЗАВА.**

### Дарэчы

Узровень зарэгістраванага беспрацоўя ў Беларусі з пачатку года амаль не мяняўся і на 1 мая склаў 0,3 % (летась на гэту дату ён складаў 0,5 %). У некаторых рэгіёнах узровень беспрацоўя нашмат ніжэйшы за рэспубліканскі: Камянецкім, Браслаўскім, Шчучынскім, Бярэзінскім, Дзяржынскім, Крупскім, Мінскім, Смалявіцкім, Быхаўскім і ў Мінску (0,1 %).

Але больш паказальныя не абсалютныя лічбы, а дынаміка. Паводле звестак на пачатак мая, на ўліку стаяць 14,5 тысячы чалавек (на 33,5 % менш за леташні паказчык). Найменшыя заявілі пра наяўнасць 80,6 тысячы вольных працоўных месцаў, што на 22,8 % больш, чым летась. А попыт на работнікаў па працоўных прафесіях склаў 63,1 % ад агульнага ліку вакансій супраць 61,4 % на 1 мая 2018 года.

## ТРЫЦЦАЦЬ СУБОТ ПЕРАД ВОДПУСКАМ

**1 чэрвеня вячэрняе шоу «Макаёнка, 9», што выходзіць па суботах на канале «Беларусь 1», адзначыць своеасаблівы мініюбілей — 30-ы выпуск.**



Гасцямі праграмы ў гэты вечар стануць лідар вядомага гурта «Няшчасны выпадак» Аляксей Кортнеў, прадстаўнік Беларусі на дзіцячым «Еўрабачанні-2016» Аляксандр Мінёнак і адна з самых стыльных беларускіх тэлевядучых Алена Спірыдовіч, якая, дарэчы, анансуе будучы мастацкі форум «Славянскі базар у Віцебску».

«За адзін тэлесезон мы прывялі ў праграму столькі сусветных зорак, колькі часам не бывае на канале і за некалькі гадоў, — падводзіць вынікі вядучы праекту Яўген Перлін. — У нашым эфіры не толькі раскрыліся з новага боку вядомыя беларусы Павел Харланчук, Вадзім Галыгін і Паца-Ваца, але і здолелі заявіць пра сябе шырокай аўдыторыі многія пачынаючыя артысты». Кожны з гасцей «юбілейнага» выпуску таксама падрыхтаваў для гледачоў пэўныя цікавыя сюрпрызы і падарункі. А пасля трыццатага выхаду ў эфіры «Макаёнка, 9» і яго стваральнікі сыходзяць у летні адпачынак — зрэшты, абяцаючы хутка вярнуцца.

**Вікторыя ЦЕЛЯШУК.**






## ШАХМАТНЫ КЛУБ

Выпуск № 70

Наш чытач з Мінска Міхаіл Кошаль вырашыў павіншаваць з днём народзін майстра спорту па шахматнай кампазіцыі М. Бельчыкава не толькі пажаданнем здароўя, жыццёвых і творчых поспехаў, але і сваёй задачай, дзе частка фігур сімвалізуе ініцыял «Н» пад выявай ферзя ***(гл. дыяграму).***



**Белыя:** Крh7, Фf6, Лс5, пп. d4, d5, e2, g2 (7).

**Чорныя:** Крe4, Cf4, пп. c6, e3, e5, g3, g4, g5 (8).

Мат за 2 хады.

Дасылайце рашэнні на адрас: газета «Звязда», вул. Б. Хмяльніцкага, 10а, 220013, г. Мінск) або на электронны адрас вядучага аддзела: vadim_ne67@mail.ru.

* * *

У Гродне прайшлі першынствы Беларусі па хуткіх шахматах (рапідзе) і бліцы сярод хлопчыкаў і дзяўчынак да 14 і 16 гадоў. У абедзвюх катэгорыях чэмпіёнамі сталі: да 14 гадоў — Максім Царук (Светлагорск), да 16 — Яраслаў Наумовіч (Мінск) і Ксенія Зелянцова (Бабруйск). Сярод дзяўчынак да 14 гадоў у рапідзе перамагла Ксенія Норман (Гродна), а ў бліцы — Аляксандра Шабан (Кобрын).

* * *

Мікіта Маёраў і Кірыл Ступак падзялілі 1—2 месцы на турніры ў Стакгольме. У Грэцыі на Мемарыяле Капабланкі Вячаслаў Зарубіцкі быў трэці. У камандным першынстве Расіі ў Сочы маскоўскі клуб «Істра», на першай дошцы якога выступала наша Вольга Бадэлька, заняў 4-е месца — Вольга выйграла пяць партый пры двух пройгрышах і дзвюх нічыіх; унічыю яна згуляла ў тым ліку з экс-чэмпіёнкай свету Аляксандрай Касцянюк.

У Маскве на дзіцячым турніры гарадоў-герояў брэстаўчанка Аляксандра Тарасенка заняла 3-е месца ў рапідзе і 2-е ў бліцы, а яе зямлячка Ксенія Ланец — 3-е ў бліцы.

* * *

Беларускія шахматысты ўжо шмат дзесяцігоддзяў бяруць удзел у спаборніцтвах па «завочных» шахматах — раней з дапамогай паштовай перапіскі, цяпер пераважна праз інтэрнэт. Нядаўна завяршыўся паўфінал 21-й сусветнай завочнай алімпіяды — у другой групе 1—2-е месцы падзялілі каманды Расіі і Беларусі, абедзве выйшлі ў фінал. На сваіх дошках першыя месцы занялі І. Сквіра і В. Маскалёў, другое — Л. Шацько, трэцяе — У. Дубко. За нашу зборную выступалі таксама А. Осіпаў і І. Лемутаў.

Завяршыўся і фінал папярэдняй 20-й завочнай алімпіяды. Беларусь мела перадапошні рэйтынг з 12 каманд-удзельніц, але заняла дастаткова высокае 4-е месца. На сваёй дошцы А. Малашанкаў быў першы, М. Шаблінскі — другі, С. Уласевіч — трэці. За беларускую каманду гулялі таксама В. Прымакоў, С. Рынкевіч і В. Віслагузаў.

А яшчэ не так даўно пасля двух з паловай гадоў гульні фінішаваў міжнародны турнір «Блакітныя азёры-4» (15 шахматыстаў з 10 краін). 1—2-е месцы падзялілі Анатоль Осіпаў (Беларусь) і Марцін Оскар (Іспанія).

* * *

У Афінах адбыўся XIV чэмпіянат Еўропы па рашэнні шахматных кампазіцый. У асабістым заліку (65 удзельнікаў) перамог 16-гадовы расіянін Даніла Паўлаў. На другім месцы — шматразовы чэмпіён свету Пётр Мурдзя (Польшча), на трэцім — знакаміты англійскі гросмайстар (прычым двойчы — па практычнай гульні і па рашэнні) Джон Нан. З беларусаў Аляксандр Булаўка заняў 31-е месца, а Мікалай Сігневіч — 43-е. У камандным заліку прызавую тройку склалі Расія, Польшча і Вялікабрытанія. Беларуская каманда выступала, на жаль, няпоўным складам (два ўдзельнікі замест чатырох) і заняла 11-е месца, апярэдзіўшы Грэцыю, Нідэрланды і Румынію.

* * *

Рашэнне задачы з мінулага выпуску: 1. Kd2! ~ 2. Фe4+, 1 ...Ф:d3 2. Лa5+, 1...C:d3 2. Лh5+. Першымі адказалі Уладзімір Ізотаў, Віктар Жук, Васіль Жуковіч, Сяргей Цяльпук, Ігар Ананіч.

**Вадзім ЖЫЛКО.**

Сядзі і глядзі

# Тры нагоды ўключыць тэлевізар

## ДЗЕЦІ

У Міжнародны дзень абароны дзяцей адчуць сябе зноў маленькімі могуць і дарослыя — дзякуючы тэматычнаму кінапаказу, што зладзіць сацыякультурны канал «Беларусь 3».



Цягам дня ў эфіры будуць паказаныя дзіцячыя прыгодніцкія і казачныя кінастужкі розных часоў: «Снежная каралева» (1966), «Тры талеры» (2005), «Тум-Пабі-Дум» (2017), мюзікл «Мама» (1976), камедыя «Вусаты нянь» (1977).

А Першы нацыянальны канал Беларускага радыё прапануе слухачам удзел у інтэрактыўнай гульні — апазнаць у сацыяльнай сетцы «Аднакласнікі» журналістаў і радыёвядучых па іх дзіцячых фота. Прыз абяцаюць самы што ні ёсць дзіцячы — брэндаваны заплечнік, а самаму актыўнаму гульцу — кілаграм смачных цукерак!

## ПУШКІН

Пра 220-годдзе класіка рускай літаратуры (ягоны дзень нараджэння адзначаецца 26 мая па старым стылі і 6 чэрвеня — па новым) нагадае тэлеканал «Культура». 3—6 чэрвеня тут будуць паказваць «Маленькія трагедыі» прызнанага майстра экранных версій твораў рускай класікі, рэжысёра Міхаіла Швейцэра. Трохсерыйны мастацкі фільм, зняты сорак гадоў таму, упрыгожвае цэлы россып вядомых савецкіх акцёраў: Сяргей Юрскі, Валерый Залатухін, Івар Калныньш, Інакенцій Смактуноўскі, Георгій Тараторкін, Леанід Кураўлёў, Ларыса Удавічэнка, Лідзія Федасеева-Шукшына, Аляксандр Трафімаў і, канешне, акцёр і бард Уладзімір Высоцкі, які сыграў у сцэне «Каменны госць» сваю апошнюю ролю — лавеласа Дон Жуана...

Акрамя таго, на тыдні «Культура» парадуе ўсіх тых, хто чытаў Пушкіна не толькі ў сціслым пераказе ў хрэстаматыі, яшчэ шэрагам фільмаў паводле яго кніг: «Дуброўскі», «Капітанская дачка», «Аповесці Белкіна», «Завея», мультфільмам «Казка пра цара Салтана», дакументальнымі, біяграфічнымі стужкамі і дэкламацыяй Пушкіна ў выкананні папулярных акцёраў.





## МУЗЫКА

200-годдзе выбітнога кампазітара і дырыжора Станіслава Манюшкі, якое сёлета шырока адзначаецца па ўсім свеце, натхніла на творчыя вопыты не толькі сучасных музыкантаў, але і тэлевізійнікаў. Так, Белтэлерадыёкампанія падрыхтавала да юбілею дакументальную стужку «Залатыя рыбкі музыкі Станіслава Манюшкі».

«У пошуках Манюшкі мы перадусім адправіліся на Міншчыну, у вёску Убель, дзе калісьці нарадзіўся класік», — расказвае аўтар фільма Алеся Зелянко. Далей маршрут здымачнай групы пралягаў праз пасёлак Азёрны, гарадскі пасёлак Смілавічы, горад Чэрвень, аграгарадок Алесіна, вёску Данюшава, праз Мінск і Гомель — усе тыя месцы, дзе так ці інакш захаваліся сляды Манюшкі. У фільме ўзялі ўдзел звыш 20 навукоўцаў, музыкаў і даследчыкаў — аўтараў тэматычных манаграфій, якія больш поўна распавялі пра станаўленне творцы, яго значэнне ў беларускай і сусветнай культуры і, канешне, пра захаванне памяці... Тэлепрэм'ера стужкі і святочны канцэрт Вялікага тэатра Беларусі, складзены з твораў Станіслава Манюшкі, запланаваныя на 15 чэрвеня — на канале «Беларусь 3».

Тэлесеткі

## ПАГЛЯДЗЕЦЬ НА УЗБЕКІСТАН

Зрабіць гэта можна будзе дзякуючы мемарандуму аб узаемаразуменні, які падпісалі днямі Белтэлерадыёкампанія і Нацыянальная тэлерадыёкампанія Узбекістана. Апошняя, дарэчы, аб'ядноўвае 12 тэлеканалаў, чатыры радыёстанцыі і яшчэ 12 рэгіянальных тэлекампаній.

У прыватнасці, старшыня БТРК Іван Эйсмант і кіраўнік узбекскага медыяхолдынга Алішэр Хаджаеў абмеркавалі магчымасці наладжвання непасрэднага творчага кантакту: відэа- і фотаздымкі, абмен тэлепраграмамі, радыё- і аўдыявізуальнымі матэрыяламі, якія адлюстроўваюць гісторыю і сучаснасць абедзвюх краін.

**Вікторыя ЗАХАРАВА.**

## субота, 8 чэрвеня

### Беларусь 1

6.20 «Існасць».
**6.45, 21.45 Меладрама «Каханне не дзеліцца на 2». 1—4-я серыі (12+).**
8.15 «Кулінарная дыпламатыя» (12+).
8.50 Выпускныя экзамены па беларускай і рускай мовах, па матэматыцы за перыяд навучання і выхавання на ІІ ступені агульнай сярэдняй адукацыі.
9.00, 12.00, 15.00 Навіны.
9.10 «Маршрут пабудаваны» (12+).
9.50 «Здароўе» (12+).
10.40 «Дача» (12+) [СЦ].
**11.20, 12.10 Меладрама «Навучаю гульні на гітары». 1-я серыя (16+).**
15.15 «Краіна».
**15.45 Серыял «Сваты-5» (12+).**
**16.50 Меладрама «Ганна». 1—4-я серыі (16+).**
21.00 «Панарама».
0.55 «Дзень спорту».

### Беларусь 2

**7.00 Серыял «Цэнтральная бальніца» (16+).**
8.35, 21.55 «Тэлебарометр».
8.40 Анімацыйны фільм «Захавальнікі сноў» (0+).
10.10 «Пагоня за смакам» (16+).
11.05 «Хто я?» (12+)
11.25 «Капейка ў капейку» (12+).
12.00 «Камень, нажніцы, папера» (16+).
12.35 «Муж напракат» (16+).
13.35 «Вясельны памер» (16+).
**14.35 Фантастыка «Валяр'ян і горад тысячы планет» (12+).**
16.50 «Тата папаў» (16+).
17.40 «Да пабачэння» (16+).
**18.25 Трылер «Ілюзія падману-2» (12+).**
**20.25 Меладрама «Паўночнае сонца» (16+).**
22.00 «Спортлато 6 з 49», КЕНО.
**22.05 Фантастыка «Трансформеры» (12+).**

### Беларусь 3

7.35 «Сіла веры».
8.00, 14.40, 20.15 Навіны культуры.
8.20, 15.00, 20.35 «Гэты дзень».
8.25 М/ф (0+).
**8.35 «Белыя Росы». Камедыя (12+) [СЦ].**
10.00 «Жывая культура». Традыцыйная тэхналогія выпечкі жытняга хлеба ў вёсцы Дзеркаўшчына Глыбоцкага раёна Віцебскай вобласці.
10.30 «Беларуская кухня». Куханы.
**10.55 «Снайпер. Зброя помсты». Маст. фільм (12+).**
14.10 «Навукаманія» (6+).
15.05 «Віртуозы». Канцэрт выпускнікоў Рэспубліканскай гімназіі-каледжа, прысвечаны 30-годдзю аркестра.
**16.00 «Тры тапалі на Плюшчысе». Меладрама (12+) [СЦ].**
17.20 «Дзесяць фатаграфій». Наталля Белахвосціквава (12+).
**18.00 «Законны шлюб». Маст. фільм (12+).**
19.30 «Я хачу гэта ўбачыць!» (6+)
20.00 «Суразмоўцы».
20.40 «Калыханка» (0+).
**21.05 «Вазьму твой боль». Драма (12+) [СЦ].**
22.30 Урачыстае адкрыццё XIX Нацыянальнага фестывалю беларускай песні і паэзіі «Маладзечна-2019». Канцэрт «Песні вайны», прысвечаны 75-годдзю вызвалення Беларусі ад нямецка-фашысцкіх захопнікаў.

### Беларусь 5

6.45 Тэніс. «Ралан Гарос». Мужчыны. 1/2 фіналу.
8.50 Футбол. Кваліфікацыя да ЧЕ-2020. Украіна — Сербія.
10.40 Наша Алімпіяда.
11.10 Футбол. Чэмпіянат свету. Жанчыны. Францыя — Паўднёвая Карэя.
13.05 Вялікі спорт.
13.50 Футбол. Кваліфікацыя да Еўра-2021 (U-21). Беларусь — Гібралтар.
15.55 Трэніровачны дзень.
16.30 Спорт-цэнтр.
16.45 Валейбол. Залатая Еўраліга. Жанчыны. Азербайджан — Беларусь.
18.50 Валейбол. Залатая Еўраліга. Мужчыны. Чэхія — Беларусь.
20.50 Футбол. Кваліфікацыя да ЧЕ-2020. Прэв'ю.
21.20 Футбол. Кваліфікацыя да ЧЕ-2020. Беларусь — Германія.
23.30 Футбол. Кваліфікацыя да ЧЕ-2020. Дзённік гульнявога дня.
0.05 Тэніс. «Ралан Гарос». Жанчыны. Фінал.

### АНТ

7.00, 9.00, 16.00 (з субцітрамі) «Нашы навіны».
7.10 «Іграй, гармонік любы!» (6+)
8.00 Да 90-годдзя сявячкі. «Людміла Зыкіна. «Опустела без тебя земля...» (12+).
9.10 «Хіт на сняданак» (12+).
9.50 «Тэорыя змовы» (16+).
10.45 «Ідэальны рамонт» (6+).
11.55 «Вакол смеху» (16+).
**12.30 Серыял «Зламаныя лёсы» (12+).**
16.20 «Хто хоча стаць мільянерам» (12+).
18.00 «Сёння вечарам» (16+).
20.00 «Нашы навіны». Суботні выпуск.
20.45 «Метэагід».
**21.10 Серыял «Пакуль жыву, кахаю» (12+).**
0.40 «Інакенцій Смактуноўскі. За гранню розуму» (12+).

### СТБ

6.10 «Ежа багоў» (16+).
7.50 «Анфас».
8.10 «Самая карысная праграма» (16+).
9.00 «Тайны Беларусі» (16+).
10.00 «Мінск і мінчане».
10.35 «Цэнтральны рэгіён».
11.05 «Вадзіць па-руску» (16+).
**11.30, 13.40, 16.50, 20.05 «Меч-2». Серыял (16+).**
13.30, 16.30, 19.30 Навіны «24 гадзіны».
19.55 «СТБ-спорт».
22.00 Дакументальны спецпраект (16+).
**1.10 «Метад». Серыял (18+).**

### МІР

6.00 М/ф (0+).
6.15 «Мільён пытанняў пра прыроду» (6+).
6.25 «Саюзнікі» (12+).
6.55 «Такія розныя» (16+).
7.25 «Сакрэтныя матэрыялы» (16+).
8.00 «Каханне без межаў» (12+).
9.00 «Вой, мамачкі!» (12+)
9.25 «Народжаныя ў СССР» (12+).
10.00, 13.00, 16.00, 19.00 Навіны.
10.15 «Як у рэстаране» (12+).
**10.45, 16.15, 19.15 Серыял «Адліга» (16+).**
**1.50 Маст. фільм «Мядовы месяц» (6+).**
**3.30 Маст. фільм «Танцуй, танцуй» (12+).**

### РТР—Беларусь

7.00 «Раніца Беларусі».
10.00 «Сто да аднаго» (12+).
11.00 Весткі.
11.20 «Тайны Беларусі» (12+).
12.30 Да 220-годдзя з дня нараджэння А. С. Пушкіна. «Пушкін» (16+).
**14.25 Маст. фільм «Пятроўка, 38» (12+).**
**16.10 Маст. фільм «Без права на памылку» (12+).**
19.45 «Плюс мінус». Надвор'е на тыдзень.
20.00 Весткі ў суботу.
20.55 «Прывітанне, Андрэй!» (16+)
**22.55 Маст. фільм «На досвітку» (12+).**

### НТБ—Беларусь

6.10 «Астрапрагноз».
6.20 Terra incognita. Беларусь невядомая (6+).
6.50 «Зразумець і абясшкодзіць» (12+).
7.20 «Падазраюца ўсе» (16+).
8.00, 10.00, 16.00 Сёння.
8.20 «НЗ.by».
8.50 «Урачэбныя тайны плюс» (12+).
9.25 «Гарады Беларусі» (6+).
10.25 Галоўная дарога (16+).
11.05 «Ежа жывая і мёртвая» (12+).
12.00 Кватэрнае пытанне (0+).
13.05 «Паедзем, паядзім!» (0+)
**14.00 Серыял «Пераможцы» (16+).**
16.25 «Следства вялі...» (16+)
17.05 «Сакрэт на мільён». Анастасія Стоцкая (16+).
19.00 «Цэнтральнае тэлебачанне».
20.35 «Ты супер!» Да і пасля (6+).
**22.15 Маст. фільм «Мой грэх» (16+).**
0.05 «Сусветная закуліса. Тайна вечнага жыцця» (16+).

### 8 канал

7.00, 18.50, 21.05, 0.45 «Надвор'е + Эрана».
7.05 М/ф «Баранчык Шон».
7.15 Дак. фільм «Дзіцяняты ў дзікай прыродзе».
8.05 М/ф «Аладзін».
9.35 «Утрамдзія».
**9.40 Фантастыка «Мсціўцы» (16+).**
**11.45 Прыгоды «Блакітная лагуна» (16+).**
**13.35 Прыгоды «Вяртанне ў блакітную лагуну» (16+).**
15.20 «Глядзім усёй сям'ёй». М/ф «Русалачка» (0+).
**16.45 Дэтэктыў «Злавіць злодзея».**
18.35 «Сябры дзядулі Марка» (0+).
**18.55 Меладрама «Усё або нічога» (16+).**
20.50 «Вечарніца» (0+).
**21.10 Драма «Шпіёнскія гульні» (16+).**
**23.15 Камедыя «Аперацыя пад прыкрыццём» (6+).**

## аўторак, 4 чэрвеня

### ВТБ

6.05 «Лаві момант» (16+).
7.00 «Дурні і дарогі» (16+).
8.20 «Ералаш» (6+).
8.30 М/ф «Джынглікі» (0+).
9.00 М/ф «Машыны казкі» (0+).
9.35, 0.25 «Уральскія пельмені» (16+).
10.40, 17.30 Серыял «Шчаслівыя разам» (16+).
12.05, 5.10 «Супермамачка» (16+).
13.10, 1.25 Серыял «Вароніны» (12+).
14.45, 2.25, 3.55 Скетчшоу «Адна за ўсіх» (16+).
15.10 Камедыя «Зялёны Шэршань» (12+).
19.00, 4.20 Серыял «Анжаліка» (16+).
20.00 Серыял «Кухня-6» (16+).
22.00 Баявік «S.W.A.T.: спецназ горада Ангелаў» (16+).
2.40 Серыял «Бязмоўны сведка» (16+).

### Культура

6.30, 7.00, 7.30, 10.00, 15.00, 19.30, 23.30 Навіны культуры.
6.35 «Пешшу...» Масква армянская.
7.05 «Правілы жыцця».
7.35 «Легенды сусветнага кіно». Тацццяна Акунеўская.
8.00 «Медны вершнік». Чытае Міхаіл Казакоў.
8.30, 21.45 «Маленькія трагедыі». Маст. фільм [СЦ] (0+).
10.15 «Назіральнік».
11.10, 1.20 XX стагоддзе. «Майстры мастацтваў. Эліна Быстрыцкая». 1982 год.
12.10 «Дарогі старых майстроў». «Аблічча неба і зямлі».
12.25, 18.45, 0.35 «Тым часам. Сэнсы».
13.15, 21.05 «Абсалютны слых».
13.55, 18.25 «Першыя ў свеце». Дак. серыял.
14.10, 20.05 «Невядомая планета Зямля» [СЦ].
15.10 «Пятае вымярэнне» [СЦ].
15.40 «Белая студыя».
16.25 «Гісторыя мастацтва». Вольга Свібліва. «Мастакі арт-групы «AES + F».
17.20 «Маленькія сакрэты вялікага конкурсу. З гісторыі Міжнароднага конкурсу імя П. І. Чайкоўскага».
17.50 Насустрач конкурсу Чайкоўскага. Лаўрэаты. Андрэй Эніца.
19.45 Галоўная роля.
20.50 «Добрай ночы, малыя!»
23.00 «Заўтра не памрэ ніколі». Дак. серыял [СЦ].
23.50 «Мікалай Фёдараў. Прароцтвы аб Расіі». Дак. фільм.
2.20 «Алтайскія кержакі». Дак. фільм.
2.50 «Колер часу». Пабла Пікаса. «Дзяўчынка на шары».

### Настальгія

6.00 Маст. фільм «Варатар» (12+).
7.20 «Вакол смеху». «Пра анекдот». 1990 год (12+).
9.00, 15.00, 21.00 «Мінулы час» (12+).
9.45, 11.45, 12.40, 14.15, 15.45, 17.00, 18.45, 20.15, 21.45, 23.00, 1.05, 5.15 Музычная настальгія (12+).
9.55 Фільм-спектакль «Адзіны сведка». 1973 год (16+).
12.00 «Акулы пяра». Леанід Якубовіч. 1996 год (18+).
13.05, 19.05 Маст. фільм «І гэта ўсё пра яго» (16+).
14.50 М/ф «Ух ты, рыба, якая гаворыць!» (12+)
16.00, 22.00, 0.00 «Народжаныя ў СССР» (12+).
17.20 Серыял «33 квадратныя метры. Дачныя гісторыі» (16+).
18.00 «Быў час» з Аляксандрам Паліткоўскім: «Савецкія ўласкары ЦТ». 2007 год (16+).
1.25 «Гэты фантастычны свет». «Уменне кідаць мяч». 1988 год (12+).
3.00 «Быў час». 2009 год (16+).
4.00 Маст. фільм «Печнікі» (16+).

### EuroSport 1

0.35, 2.30, 4.00, 6.30, 8.30, 13.30, 14.55, 18.15, 21.30 Тэніс. «Ралан Гарос».
2.00, 6.00, 14.25, 21.00 «Гейм, Шэт і Матч».
5.00, 7.30, 9.30, 12.30 Веласпорт. «Джыра д'Італія».
10.30 Настольны тэніс. Сусветны тур.
11.30 Стральба з лука. Кубак свету.
18.00 «Гейм, Шэт і Матч»-экстра.
22.30 «Найлепшае з конкурса спорту».
23.00 Аўтагонкі. Blancpain Endurance.

### Кінакамедыя

0.35 Каханне — гэта для дваіх (16+).
2.30 Забойны агеньчык (16+).
4.10 Пацучыныя скачкі (12+).
6.05 Навагодні адрыў (16+).
7.45 Гуляй, Вася! (16+)
9.40 Замуж на два дні (12+).
11.45 Настаўнік года (16+).
13.55 Каханне — гэта для дваіх (16+).
15.50 Грамабой (12+).
17.35 Захачу і саскочу. Супергероі (16+).
19.30 Красуня на ўсю галаву (16+).
21.35 Містар Фелічыта (16+).
23.20 Адной левай (12+).

### ТБ3

6.00 М/ф (6+).
7.05 «Школа доктара Камароўскага» (6+).
7.35 «Доктар І...» (16+)
8.05, 19.10, 2.40 «Адплата». Серыял (16+).
10.00, 23.40, 5.30 «Улецы» (12+).
10.30, 4.00 «Судовыя страсці». Дак. серыял (16+).
12.10, 17.55 «Варажбіткa» (12+).
13.45, 16.50 «Містычныя гісторыі» (12+).
14.50 «Суд ідзе» (16+).
15.55 «Натуральны адбор» (12+).
20.55 «Менталіст». Серыял (16+).
22.50 «90-я» (16+).
0.10 «Звышнатуральнае». Серыял (16+).
0.55 «Люстэркі». Трылер (18+).

### ТБ1000

6.10, 14.10 Чаго хочуць жанчыны (16+).
8.35 Восень у Нью-Ёрку (12+).
10.40 Фантастычнае каханне і дзе яго знайсці (16+).
12.25 Бібліятэкар: у пошуках кап'я лёсу (16+).
16.35 Апошняе каханне на Зямлі (16+).
18.25 Я не ведаю, як яна робіць гэта (16+).
20.10 Усмешка Моны Лізы (12+).
22.30 Візантыя (16+).
0.45 Бацькі і дочкі (18+).
2.55 Іншыя (16+).
4.40 Дзеці шпіёнаў (6+).

### ТБ1000 Рускае кіно

6.20 Прыстойныя людзі (16+).
8.15 Яраслаў. Тысячу гадоў таму (16+).
10.20 Увосень 41-га (12+).
12.20, 4.20 Не пакідай мяне (12+).
14.20 Канікулы прэзідэнта (16+).
16.20 Каханне з абмежаваннямі (16+).
18.20 Чорныя кошкі (16+).
20.20 Прывід (6+).
22.35 Адной левай (12+).
0.15 За гранню рэальнасці (12+).
2.20 Іронія лёсу. Працяг (12+).

### National Geographic

6.00, 5.35 Навуковыя недарэчнасці (16+).
6.25, 14.15 Нараджэнне Еўропы (16+).
7.20, 13.30 Сіла племені (16+).
8.05 Дзікі тунец (16+).
9.35 Закінутыя скарбы Майя (16+).
10.20 Каралі шахт (16+).
11.05, 16.35, 19.00, 22.00, 3.25 Аўта-SOS (16+).
12.40, 18.10 Варожая планета (16+).
15.05, 4.55 Суперзбудаванні (16+).
15.50, 2.40 Расследаванні авіякатастроф (16+).
20.30 Загадкі волатаў каменнага стагоддзя (16+).
21.15 Закінутыя скарбы змяіных цароў майя (16+).
23.30 Апакаліпсіс: Другая сусветная вайна (16+).
0.20 Ліхтугі за мяжой (16+).
1.55 Служба бяспекі аэрапорта (16+).

### Discovery

8.00 Як гэта зроблена? (12+)
8.25, 18.30, 1.50 Залатыя шляхі Паркера Шнабеля (16+).
9.20, 16.40, 22.10 Махінатары вяртаюцца (12+).
10.15, 17.35, 4.35 Хуткія і гучныя (12+).
11.10, 15.45, 21.15 Як пабудаваць... што заўгодна (12+).
12.05, 23.05 Паляўнічыя на рэлікціі (16+).
13.00 Браты Дызель (12+).
14.50, 3.40 Амерыканскі чопер (12+).
19.25 Чыгунка Аўстраліі (12+).
20.20, 5.30 Паляўнічыя на склады (16+).
0.00 Умельцы супраць апакаліпсіса (12+).
0.55, 6.20 Эд Стафард: гульня на вылет (16+).
2.45 Што хаваюць мумії? (12+)
7.10 Забытая інжынерыя (12+).

### Беларусь 1

6.00, 7.20, 8.15 «Добрай раніцы, Беларусь!»
7.00, 8.00 (з сурдаперакладам), 9.00, 12.00, 13.00, 15.00, 17.00, 19.00, 1.00 Навіны.
7.05, 8.05 Навіны эканомікі.
7.10, 8.10, 18.15 «Зона Х» (16+).
9.10 Серыял «След» (16+).
10.55, 12.10, 18.45, 19.20 Серыял «Прыгожае жыццё» (16+).
13.05 «Дзіцячы доктар».
13.35 «Дзень у вялікім горадзе».
14.35, 15.25 Серыял «Вераніка не хоча паміраць» (16+).
15.15, 18.00 Навіны рэгіёна.
17.05 Серыял «Сваты-5» (12+).
21.00 «Панарама».
21.50 Меладрама «Навучаю гульні на гітары». 1—4-я серыі (16+).
1.15 «Дзень спорту».

### Беларусь 2

7.00 «Уключайся!» (12+)
9.00, 18.05 «Тэлебарометр».
9.05, 20.00 Серыял «Сляпая» (16+).
10.05, 20.55 «Арол і рэшка. Рай і пекла» (16+).
11.05, 18.10 Серыял «Опер па выкліку» (16+).
13.00 Серыял «Жаночы доктар» (16+).
13.55 «Вясельны памер» (16+).
14.55 М/с «Чып і Дэйл спяшаюцца на дапамогу» (0+).
15.40 «Нічога сабе ньюз» (12+).
15.45, 0.05 «Пін_код». Інтэрактыўны маладзёжны праект (12+).
16.35 Серыял «Цэнтральная бальніца» (16+).
17.30 «Калі мы дома». Скетчкам (16+).
22.00 «Спортлато 5 з 36», КЕНО.
22.05 «Бітва экстрасэнсаў. 17-ы сезон» (16+).

### Беларусь 3

7.00 «Дабранакак».
7.35, 12.25 «Беларуская кухня». Запечаны гарбуз.
8.05, 12.00, 20.15 Навіны культуры.
8.25, 12.20, 20.35 «Гэты дзень».
8.30, 17.50 «Мая маракча». Камедыя (12+) [СЦ].
9.45 «Падкідыш». Камедыя (6+) [СЦ].
10.55 «Майстэрня. Гісторыя аднаго мастака». Ганна Сілівончык і Васіль Пяшкун.
11.20, 21.05 «Апошні дзень». Леў Дураў (12+).
12.50 «Сіла веры».
13.20 «Партызаны». Ганна Маслоўская (12+) [СЦ].
13.45, 19.05 «ВМФ СССР. Хроніка Перамогі». «Лідар эскадраных мінаносцаў» (12+).
14.10, 21.40 «Вызваленне». Маст. фільм. «Апошні штурм» (12+) [СЦ].
15.25, 20.00 «Архітэктура Беларусі».
15.40 «Канікулы Пятрова і Васечкіна, звычайныя і неверагодныя». Фільм — дзецям. 2-я серыя (6+).
16.55 «Казка пра мёртвую царэўну і пра сем асілкаў». М/ф (0+).
17.20 «Запіскі на палях». Ян Баршчэўскі: фантастычная гісторыя [СЦ].
19.35 «Камертон». Дырыжор, заслужаны артыст Рэспублікі Беларусь Аляксандр Крамко.
20.40 «Калыханка» (0+).
22.55 «Час кіно». Работы студэнтаў Беларускай дзяржаўнай акадэміі мастацтваў.
23.05 «Шматкроп'е...» Дак. фільм (12+).

### Беларусь 5

7.00 Тэніс. «Ралан Гарос». Жанчыны. 1/2 фіналу.
9.05 Лёгкая атлетыка. Брыльянтавая ліга. Рым.
11.15 Футбол. Таварыскі матч. «Дынама» (Брэст) (U-13) — БАТЭ (Барысаў) (U-13).
13.15 Гульні.by.
13.35 Спорт-мікс.
13.45 Тэніс. «Ралан Гарос». Мужчыны. 1/2 фіналу.
15.45 Футбол. Кваліфікацыя да ЧЕ-2020. Відэачасопіс.
16.20, 19.20 Футбол. Чэмпіянат свету. U-20. 1/4 фіналу. (У перапынку — Спорт-цэнтр.)
18.20 Фактар сілы.
18.50 Наша Алімпіяда.
21.25 Футбол. Кваліфікацыя да ЧЕ-2020. Украіна — Сербія. (У перапынку — Спорт-цэнтр.)
23.30 Змешаныя адзінаборствы. Міжнародны турнір.

### АНТ

6.00, 7.05, 8.05 «Наша раніца».
7.00 (з субцітрамі), 8.00 (з субцітрамі), 9.00 (з субцітрамі), 11.00, 13.00, 16.00, 18.00 (з субцітрамі), 20.30 Нашы навіны.
9.10 «Сёння 7 чэрвеня. Дзень пачынаецца» (6+).
9.50 «Жыць здорава!» (16+).
11.10 Серыял «Вой, ма-мачкі!..-2» (12+)
12.05 «Модны прыгавор» (12+).
13.10 Серыял «Позняе раскаянне» (16+).
15.00 «Давай пажэнімся!» (16+)
16.20, 0.35 «Трывожная кнопка» (16+).
16.40 «Эксклюзіў» (16+).
18.20 «Вакол смеху» (16+).
18.55 «Удача ў прыдачу!» Дзённік (12+).
19.00 «Поле цудаў» (16+).
20.00 «Час».
21.10 «Тры акорды» (16+).
23.10 «Што? Дзе? Калі?» у Беларусі». Летняя серыя гульняў (16+).

### СТБ

5.35, 22.10 «Глядзець усім!» (16+)
6.00, 7.30, 10.30, 13.30, 16.30, 19.30, 22.30 Навіны «24 гадзіны».
6.10, 20.15 «Міншчына».
6.20, 7.50 «Раніца. Студыя добрага настрою» (6+).
7.40, 13.50, 16.50 «Экстранны выклік».
9.15 «Спецыяльны рэпартаж СТБ».
9.35, 23.00 «Загадкі чалавецтва» (16+).
10.40 «Аляксандраўскі сад». Серыял (16+).
12.35, 21.25, 23.45 «Самыя шакіруючыя гіпотэзы» (16+).
14.00 «Неверагодна цікавыя гісторыі» (16+).
14.45 «Як устроены Сусвет» (16+).
15.35, 17.00 «Меч-2». Серыял (16+).
19.55, 22.50 «СТБ-спорт».
20.05 «Сталічныя падрабязнасці».
20.30 «Тайны Беларусі» (16+).
0.30 «Метад». Серыял (18+).

### МІР

6.00 Серыял «Сужэнцы» (16+).
6.50, 10.20 Серыял «Вышук» (16+).
10.00, 13.00, 16.00, 19.00 Навіны.
10.10 «У гасцях у лічбы» (12+).
13.15 «Зала суда. Бітва за грошы» (16+).
14.10 «Справы сямейныя. Бітва за будучыню» (16+).
15.05 «Справы сямейныя. Новыя гісторыі» (16+).
16.15 «Такому мама не навучыць» (12+).
16.45 Серыял «Вяртанне Мухтара-2» (16+).
19.20 «Сусветныя гульні розуму» (0+).
20.00, 4.15 Маст. фільм «Вас чакае грамадзянка Ніканорава» (12+).
21.45 Маст. фільм «Мядовы месяц» (6+).
23.45 Маст. фільм «Танцуй, танцуй» (12+).
2.20 «Трымайся, шоубіз!» (16+)
2.45 Маст. фільм «Музычная гісторыя» (12+).
5.45 М/ф (0+).

### РТР—Беларусь

7.00 «Раніца Расіі».
11.00, 14.00, 17.00, 20.00 Весткі.
11.25 «Пра самае галоўнае». Ток-шоу (12+).
12.35, 14.25 Серыял «Участак лейтэнанта Качуры» (16+).
13.50, 16.50, 19.50, 23.00 Навіны — Беларусь.
15.35 «Лёс чалавека» (12+).
17.25 «60 хвілін». Ток-шоу.
18.35 «Андрэй Малахаў. Прамы эфір» (16+).
20.40, 23.10 Серыял «Ангеліна» (12+).
23.40 «Хто супраць?» Ток-шоу.

### НТБ—Беларусь

6.00 «Астрапрагноз».
6.05, 7.00, 8.00, 10.00, 13.00, 16.00, 19.00 Сёння.
6.10 Спецыяльны рэпартаж (12+).
6.30 «Гісторыі рамонту» (0+).
7.10 «Мальцава» (12+).
8.05 Серыял «Мухтар. Новы след» (16+).
8.50, 10.20 Серыял «Пчаляр» (16+).
9.40, 22.40 «НЗ.by».
12.00 «Суд прысяжных» (16+).
13.25 Агляд. Надзвычайнае здарэнне.
14.00, 16.30 Серыял «Марскія д'яблы. Смерч. Лёсы» (16+).
17.25 «ДНК» (16+).
18.25 «Экспертыза злачынстваў» (16+).
19.35 Сёння. Галоўнае.
19.50 Серыял «Вуліцы разбітых ліхтароў» (16+).
20.50 Серыял «Жывая міна» (16+).
23.15 «Крутая гісторыя» (12+).

### 8 канал

7.00, 15.55, 19.00, 21.05, 0.55 «Надвор'е + Эрана».
7.05 М/с «Прынцэса Алена».
7.25, 16.00 «Гумарынка».
7.30 Камедыя «Сэрцаедкі» (16+).
9.30, 19.05 Серыял «Абдымаючы неба» (16+).
10.25 Дак. фільм «Дэтаксікацыя. Навуковы падыход».
10.50 Дак. фільм «Дом. Спатканне з планетай».
12.50, 20.00 Серыял «Смяротная зброя» (16+).
13.35 Фантастыка «Вартавыя Галактыкі» (12+).
16.30 «Сіньцзян».
17.00 Дак. серыял «Дзіцяняты ў дзікай прыродзе» (0+).
17.30 Дэтэктыў «Мярцвяк дэтэктыва Мегрэ» (16+).
20.50 «Вечарніца» (0+).
21.10 «Вячэрні квартал — 95» (18+).
22.40 «Героі коміксаў на экране». Фантастыка «Мсціўцы» (16+).



### ВТБ

6.05 «Лаві момант» (16+).
7.00 «Дурні і дарогі» (16+).
8.20 «Ералаш» (6+).
8.30 М/ф «Джынглікі» (0+).
9.00 М/ф «Машыны казкі» (0+).
9.35, 23.50 «Уральскія пельмені» (16+).
10.40, 17.30 Серыял «Шчаслівыя разам» (16+).
12.05, 5.10 «Суперамачка» (16+).
13.10, 0.50 Серыял «Вароніны» (12+).
14.45, 3.20 Скетч-шоу «Адна за ўсіх» (16+).
15.05 Баявік «S.W.A.T.: спецназ горада Ангелаў» (16+).



19.00, 4.20 Серыял «Анжаліка» (16+).
20.00 Серыял «Кухня-6» (16+).
22.00 Баявік «S.W.A.T.: вогненная бура» (12+).
2.05 Серыял «Бязмоўны сведка» (16+).

### Культура

6.30, 7.00, 7.30, 10.00, 15.00, 19.30, 23.30 Навіны культуры.
6.35 «Пешшу...» Масква пешаходная.
7.05 «Правілы жыцця».
7.35 «Легенды сусветнага кіно». Міхаіл Жараў.
8.05 «Дасягнулі мы варот Мадрыта». Дак. фільм [СЦ].
8.45, 21.45 «Маленькія трагедыі». Маст. фільм [СЦ] (0+).
10.15 «Назіральнік».
11.10, 1.20 ХХ стагоддзе. «Бенефіс Барыса Брунова ў Тэатры эстрады». 1993 год.
12.25, 18.45, 0.35 «Што рабіць?»
13.15, 21.05 «Абсалютны слых».
14.00 Дарогі старых майстроў. «Палех».
14.10, 20.05 «Невядомая планета Зямля» [СЦ].
15.10 Біблейскі сюжэт.
15.40 «Сацi. Нясумная класіка...»
16.25 Гісторыя мастацтва. Ілья Дарончанкаў. «Кропка незвароту. «Сняданак на траве» Эдуарда Манэ».
17.20 «Маленькія сакрэты вялікага конкурсу. З гісторыі Міжнароднага конкурсу імя П. І. Чайкоўскага».
17.50 Насустрач конкурсу Чайкоўскага. Лаўрэаты. Юлія Матачкіна і Арыунбаатар Ганбаатар.
18.20 Сусветныя скарбы.
19.45 Галоўная роля.
20.50 «Добрай ночы, малыя!»
23.00 «Заўтра не памрэ ніколі». Дак. серыял [СЦ].
23.50 «Гульні розуму Краіны ўзыходзячага сонца». Дак. фільм.
2.40 «Pro memoria». «Капялюшы і капялюшыкі».

### Настальгія

6.00 «Акулы пяра». Леанід Якубовіч. 1996 год (18+).
6.40, 8.15, 9.45, 11.00, 11.45, 12.45, 14.15, 15.45, 17.00, 18.40, 20.05, 21.45, 23.00, 23.45, 3.45, 5.45 Музычная настальгія (12+).
7.05, 13.05, 19.05 Маст. фільм «І гэта ўсё пра яго» (16+).
8.50 М/ф «Ух ты, рыба, якая гаворыць!» 1983 год (12+).
9.00, 15.00, 21.00, 3.00 «Мінулы час» (12+).
10.00, 16.00, 22.00 «Народжаны ў СССР» (12+).
11.20, 23.20 Серыял «33 квадратныя метры. Дачныя гісторыі» (16+).
12.00 «Быў час» з Аляксандрам Паліткоўскім: «Савецкія ўласкары ЦТ». 2007 год (16+).
18.00 «Акулы пяра». Гурт «Парк Горького». 1995 год (16+).
20.40 «Паэзія». «У нас у гасцях паэт Булат Акуджава». 1972 год (12+).
0.00 Маст. фільм «Варатар» (12+).
1.20 «Вакол смеху». «Пра анекдот». 1990 год (12+).
3.55 Фільм-спектакль «Адзіны сведка». 1973 год (16+).

### EuroSport 1

0.05, 2.30, 5.00, 6.30, 10.15, 12.20, 14.55, 18.15, 21.30 Тэніс. «Ралан Гарос».
2.00, 6.00, 14.25, 21.00 «Гейм, Шэт і Матс».
4.00, 8.30, 11.15 Веласпорт. «Джыра д'Італія».
9.30 Watts.
18.00 «Гейм, Шэт і Матс»-экстра.
22.35 Конны спорт. Global Champions League.
23.00 Конны спорт. Кубак нацый.

### Кінакамедыя

0.45 Усё пра мужчын (16+).
2.15 Карсіканец (16+).
4.00 Надзвычайныя фантазіі Чарлі Свона-Трэцяга (16+).
5.35 Безразважна закаханы (16+).
7.40 Дарый, хачу з табой аджаніцца (12+).
9.45 Пацучыныя скачкі (12+).
11.55 Забойны агеньчык (16+).



13.50 Містар Фелічыта (16+).
15.35 Секс на дзве ночы (16+).
17.15 Захачу і саскочу. Майстар-клас (16+).
19.30 Мой адзіны (16+).
21.30 Спытайце Сіндзі (16+).
23.20 Каханне не па памеры (16+).

### ТБ3

6.00 Дакументальная калекцыя Беларусьфільма (12+).
6.40 М/ф (6+).
7.50 «Школа доктара Камароўскага» (6+).
8.30 «Доктар І...» (16+)
9.00, 19.10, 2.05 «Адплата». Серыял (16+).
10.30, 3.30 «Судовыя страсці». Дак. серыял (16+).
12.10, 17.55 «Варажбітка» (12+).
13.45, 16.50, 5.10 «Містычныя гісторыі» (12+).
14.50 «Суд ідзе» (16+).
15.55 «Натуральны адбор» (12+).
20.55 «Менталіст». Серыял (16+).
22.45 «Лінія абароны» (16+).
23.20 «Звышнатуральнае». Серыял (16+).
0.05 «Горад зладзеяў». Трылер (16+).
4.20 «Суд ідзе» (16+).

### ТБ1000

6.10, 15.40 Госця (16+).
8.50 Візантыя (16+).
11.20 Усмешка Моны Лізы (12+).
13.50 Дзеці шпіёнаў (6+).
18.05 Іншыя (16+).
20.10 Капітан Філіпс (16+).
22.55 Супер Брыс (16+).
0.45 Мая дзяўчына — монстр (18+).
2.50 Перамотка (16+).
4.35 Што хавае хлусня (16+).

### ТБ1000 Рускае кіно

6.20 Адной левай (12+).
8.00 Прывід (6+).
10.15 За гранню рэальнасці (12+).
12.20, 4.20 Мільянерка. 1—2-я серыі (12+).
14.20 Іронія лёсу. Працяг (12+).
16.35 Васьмёрка (16+).
18.20 Чорныя кошкі (16+).
20.20 Чэмпіёны: хутчэй, вышэй, мацней (6+).
22.20 Ну, добры дзень, Аксана Сакалова! (16+)
0.20 Каханне пад прыкрыццём (16+).
2.20 Райскія шатры (16+).

### National Geographic

6.00, 5.35 Навуковыя недарэчнасці (16+).
6.30, 14.20 Нараджэнне Еўропы (16+).
7.20, 13.30 Сіла племені (16+).
8.10, 18.10, 22.00, 1.10, 4.15 Дзікі тунец (16+).
9.40, 12.00, 16.35, 20.30, 3.25 Аўта-SOS (16+).
11.10 Варожая планета (16+).
12.45 Закінутыя скарбы Егіпта (16+).
15.05, 5.00 Разумныя гарады свету (16+).
15.50, 19.45, 2.40 Расследаванні авіякатастроф (16+).
22.50 Аляска: выжыванне ў экстрэмальных умовах (16+).
23.35 Адплата (16+).
0.20 Ліхтугі за мяжой (16+).
1.55 Служба бяспекі аэрапорта (16+).

### Discovery

8.00 Як гэта зроблена? (12+).
8.25, 18.30, 1.50 Залаты шлях Паркера Шнабеля (16+).
9.20, 16.40, 22.10 Махінатары вяртаюцца (12+).
10.15, 17.35, 4.35 Хуткія і гучныя (12+).
11.10, 15.45, 21.15 Як пабудаваць... што заўгодна (12+).
12.05, 23.05 Паляўнічыя на рэліквіі (16+).
13.00 Паляўнічыя на старызну (12+).
14.50, 0.00 НАСА: невытлумачальныя матэрыялы (12+).
19.25 Чыгунка Аўстраліі (12+).
20.20, 5.30 Паляўнічыя на склады (16+).
0.55, 6.20 Эд Стафард: гульня на вылет (16+).
2.45 Погляд знутры (12+).
3.40 Умельцы супраць апакаліпсіса (12+).
7.10 Забытая інжынерыя (12+).

ТЭНДЭНЦЫЯ

# ВАКАНСІЯ СУПРАЦЬ ВУЧОБЫ

## Чаму назіраецца недабор на курсах для беспрацоўных?

**НЯГЛЕДЗЯЧЫ на шырокі дыяпазон курсаў, гарантаванае працаўладкаванне і атрыманне стыпендыі, у Гродзенскім гарадскім цэнтры занятасці на шэрагу спецыяльнасцяў назіраецца недабор. І прычын тут некалькі. Прафесіі, якія запатрабаваны на рынку, вабяць далёка не ўсіх. Да таго ж многія аддаюць перавагу хуткаму працаўладкаванню. Вакансій — хоць адбаўляй.**

Сітуацыя проста ўнікальная. У Гродне на аднаго беспрацоўнага прыпадае ажно тры вакансіі. Здаецца, навошта курсы пры такім дэфіцыце рабочай сілы? Але практыка паказала, што ў такой экспрэс-падрыхтоўкі нямала плюсоў.

— У першую чаргу чалавек, які сутыкнуўся з праблемай працаўладкавання, можа набыць запатрабаваную спецыяльнасць. А спецыялізаваныя веды патрэбны ў кожнай прафесіі, у тым ліку рабочай. І калі засвоіць сферу высокіх камп'ютарных тэхналогій пад сілу не кожнаму, дык атрымаць навыкі рабочай прафесіі можа амаль кожны. А такія спецыялісты будуць заўсёды патрэбны, — аргументуе сваю пазіцыю **загадчык сектара прафесійнага навучання ўпраўлення па працы, занятасці і сацыяльнай абароне насельніцтва Гродзенскага гарвыканкама Святлана ЮРКОВА.**

Гораду патрэбны кіроўцы, у тым ліку тралейбусаў. Такія групы фарміруюцца пастаянна. Напрыклад, зараз да вучобы прыступілі 11 чалавек, з іх значная частка — жанчыны.

— Такія групы фарміруюцца «пад заказ», — тлумачыць Святлана Юркова. — У цэнтр занятасці паступае заява з тралейбуснага ўпраўлення аб вакансіях і прэтэндэнтах. Перш чым трапіць да нас, чалавек знаёміцца з умовамі работы непасрэдна ў дэпо, пасля чаго яго ўключаюць у групу.

Каля трох месяцаў вывучаюць тэорыю, у тым ліку культуру абслугоўвання пасажыраў, потым 100 гадзін практыкі і яшчэ 250 — пасажырскай стажыроўкі. І пуцёўка на самастойны маршрут у руках. Сярэдняя зарплата кіроўцы — каля тысячы рублёў.

Чарговая група пачне фарміравацца ўжо ў ліпені: у горадзе адкрываюцца новыя маршруты, і на іх патрэбны дадатковы штат. Дарэчы, пасведчанне атрымалі і тры маладыя жанчыны-дэкрэтніцы. Усе яны прайшлі курсы падчас дэкрэтнага адпачынку — пасля яго заканчэння адразу выйдуць на работу кіроўцамі. І хоць практыка навучання жанчын-дэкрэтніц існуе некалькі гадоў, гродзенкі без энтузіязму ўспрымаюць такую магчымасць.

Цяпер ідзе камплектаванне груп у сферы паслуг. І прадаўцы, і кухары вельмі запатрабаваныя. Але многія з вакансій застаюцца незапатрабаванымі па зразумелай прычыне — невысокая заработная плата. Марудна ідзе фарміраванне груп будаўнічага профілю, хоць попыт на спецыялістаў гэтай галіны толькі расце.

— У нас праходзіць перанавучанне па 22 кірунках, але не ўсе карыстаюцца попытам. З пачатку года прайшлі курсы каля 60 беспрацоўных, і гэта значна менш, чым летась, калі назіраўся ажыятаж, — адзначае суразмоўніца.

Затое павялічваецца колькасць людзей, гатовых змяніць статус беспрацоўнага на статус прадпрымальніка. Адна з такіх груп, чацвёртая ў гэтым годзе, толькі што завяршыла падрыхтоўку. Людзі атрымалі навыкі суправаджэння прадпрымальніцтва, напісання бізнес-плана, ім былі дадзены безаплатныя субсідыі для адкрыцця свайго бізнесу. Да канца года такую дзяржаўную падтрымку ў Гродне атрымаюць яшчэ паўсотні беспрацоўных.

**Маргарыта УШКЕВІЧ.**

# КАДРЫ НА ПЕРСПЕКТЫВУ

**КАДРАВАЯ палітыка мае важнае значэнне для развіцця прадпрыемстваў любой галіны, таму наймальнікі павінны падтрымліваць кантакты з профільнымі навучальнымі ўстановамі і думаць на перспектыву. Старшыня Гомельскага гарадскога савета дэпутатаў Мікалай КАВАЛЕВІЧ на пасяджэнні прэзідыума адзначыў, што менавіта кіраўніцтва прадпрыемстваў павінна быць зацікаўлена ў падрыхтоўцы кваліфікаваных кадраў на перспектыву:**



Фота Андрэя САЗОНАВА.

— Важна выключыць магчымасць дэфіцыту вузкаспецыялізаваных кадраў. Пытанне забеспячэння кваліфікаванымі спецыялістамі таксама павінна вывучацца на стадыі рэалізацыі інвестпраектаў. Напрыклад: у горадзе ўзводзіцца буйны гандлёвы цэнтр, які забяспечыць рабочымі месцамі не адну сотню чалавек. Гэтую задачу не заўсёды можна вырашыць у адзін момант. Выйсце — у паслядоўнай падрыхтоўцы кадраў.

Цяпер узровень беспрацоўя ў Гомелі складае 0,4 %. Па словах **начальніка ўпраўлення па працы, занятасці і сацыяльнай абароны Гомельскага гарвыканкама Аляксандра КЛЮЧЫНСКАГА,** летась прайшлі перападрыхтоўку і перанавучанне па розных кірунках звыш 550 чалавек. Пры гэтым больш за палову з іх рыхтавалі з гарантыяй наступнага працаўладкавання:

— Сёлета плануем перанавучыць прыкладна столькі ж. А калі будзе патрэбна, то і больш. На гэтыя мэты вылучаюцца сродкі, узгоднены праграмы навучання ў дзяржаўных установах адукацыі. Наша задача не проста перападрыхтаваць чалавека, а садзейнічаць яго занятасці, каб ён змог знайсці працу, якая падыходзіць. Між тым кожны саіскальнік павінен разумець: наймальніку ён цікавы з пазіцыі наяўнага досведу, ведаў і кваліфікацыі.

Дарэчы, з пачатку дзеяння камісій па садзейнічанні занятасці насельніцтва яны дапамаглі ў працаўладкаванні больш чым 2,3 тысячы жыхароў абласнога цэнтра. Многія сталі рамеснікамі, прадпрымальнікамі, змаглі адкрыць сваю справу дзякуючы бязвыплатным субсідыям. Таксама праводзіліся кірмашы вакансій, дні прадпрыемства, на якіх патэнцыйныя наймальнікі пастаянна прапанавалі наяўныя вакансіі.

Адначасова каля 15 тысяч гамяльчан былі праінфармаваныя пра тое, што яны ўключаны ў базу працаздольных, незанятых у эканоміцы. Пры гэтым каля васьмі тысяч жыхароў абласнога цэнтра пацвердзілі факт занятасці ці наяўнасць падстаў для выключэння іх са спісаў незанятых у эканоміцы, а накont трох тысяч гамяльчан прызналі, што яны знаходзяцца ў цяжкай жыццёвай сітуацыі.

Цяпер у спісы працаздольных, не занятых у эканоміцы, уваходзяць больш за тысячу чалавек. Іх каардынаты накіраваны ў арганізацыі, якія адказваюць за ўлік, разлік і налічэнне платы за жыллёва-камунальныя паслугі і платы за жылое памяшканне. Праца камісій працягваецца, а інфармацыя па гэтай тэме абнаўляецца пастаянна.

**Ірына АСТАШКЕВІЧ.**

# КАЛІ РАБОТА ШУКАЕ ЧАЛАВЕКА

## Раённая камісія па садзейнічанні занятасці робіць упор на індывідуальны падыход

**КАМІСІЮ, якая каардынуе работу па садзейнічанні занятасці насельніцтва ў Пінскім раёне, узначальвае старшыня раённага Савета дэпутатаў Іосіф ГУЗІЧ. Камісія даволі прадстаўнічая: у яе склад акрамя кіраўнікоў і спецыялістаў структурных падраздзяленняў райвыканкама, прадстаўнікоў грамадскіх арганізацый уваходзяць дэпутаты абласнога, раённага, сельскіх Саветаў дэпутатаў. Камісія працуе з мінулага года, адбылося 23 яе пасяджэнні. Можна ўжо зрабіць некаторыя высновы, падзяліцца разважаннямі, што і робіць старшыня райсавета.**

Іосіф Іванавіч гаворыць, што ўся работа камісіі будуецца на падставе максімальнага садзейнічання грамадзянам у працаўладкаванні:

— Сваёй задачай мы лічым найперш дапамагчы тым, хто зацікаўлены ў пошуку рабочага месца, — кажа Іосіф Гузіч. — Але ж не скідаем з рахунку і асоб, якія вядуць асацыяльны лад жыцця. Часам здаецца, што нянькаемся з імі дарма і справа гэта марная. Але ж калі нават аднаго чалавека ўдасца накіраваць на правільны шлях, то нельга будзе сказаць, што камісія не апраўдала свайго прызначэння. Тым больш што Дэкрэт накіроўвае нас на індывідуальны падыход да кожнага чалавека.

Паводле інфармацыі старшыні камісіі, у 2018 годзе на рынку працы Пінскага раёна сітуацыя захоўвалася пад кантролем. У параўнанні з папярэднім годам яна характарызавалася павелічэннем попыту на рабочую сілу, зніжэннем колькасці беспрацоўных і напружанасці на рынку працы. Колькасць беспрацоўных з 96 чалавек, якія сталі на ўліку на пачатак 2018 года знізілася да 64 чалавек на 1 студзеня 2019 года. Каэфіцыент напружанасці адпаведна знізіўся за год ад 0,4 да 0,2 беспрацоўных на адну вакансію.

Летась на работу ўладкаваліся 1033 жыхары раёна, з іх 432 чалавекі з ліку беспрацоўных. З выкарыстаннем сродкаў дзяржаўнага пазабюджэтнага фонду сацыяльнай абароны насельніцтва арганізавана навучанне 23 беспрацоўных, абсалютная большасць якіх вучылася пад заказ наймальнікаў. Выкарыстоўвалася і такая форма занятасці, як накіраванне на грамадскія работы з аплатай. Такі эпізадычны заробак атрымалі 118 беспрацоўных. Магчымасць падпрацаваць рэалізавалі 443 студэнты і навучэнцы. Трое беспрацоўных атрымалі субсідыі для арганізацыі сваёй справы, два чалавекі з інваліднасцю накіраваныя на рабочыя месцы для адаптацыі.

На пачатак гэтага года вакансій было больш, чым тых, хто стаіць на ўліку ў якасці беспрацоўнага, у чатыры разы. Найбольш запатрабаваныя на рынку працы застаюцца кваліфікаваныя рабочыя, трактарысты-машыністы сельскагаспадарчай вытворчасці, кіроўцы аўтамабіля, прадаўцы, кухары, ветэрынарныя ўрачы і фельчары, заатэхнікі, аграхімікі. Таксама патрабуюцца раёну ўрачы, медыцынскія сёстры, спецыялісты ў сферы культуры. У гаспадарках не хапае жывёлаводаў, аператараў машыннага даення, рабочых будаўнічай галіны. За два гады ў раёне праведзена 17 кірмашоў вакансій, чатыры дні прадпрыемства, сустрэчы з жыхарамі па пытаннях занятасці адбыліся ў Малоткавічах і Бобрыкаўскім сельвыканкаме. Інфармацыя пра вакансіі і патрэбы на рынку працы даводзіцца да насельніцтва і пры названых сустрэчах, і праз сродкі масавай інфармацыі, і праз інтэрнэт-сайты. Напрыклад, на сайце райвыканкама створаны спецыяльны банер, дзе размешчана інфармацыя пра работу камісіі, пазначаны яе персанальны склад, графік работы, час і месца правядзення пасяджэнняў, кантакты і іншыя звесткі. Для зручнасці карыстальнікаў тэматычны банер вынесены на галоўную старонку. Але, на жаль, не выпадае гаварыць пра актыўнасць саіскальнікаў, ды па-ранейшаму толькі пытам карыстаюцца пасады вартаўніка і вахцёра, а вось на калгасную вытворчасць, у будаўніцтва ідуць не вельмі ахвотна.

Іосіф Гузіч адзначае, што з 23 пасяджэнняў камісіі шэсць былі выязныя, праходзілі на тэрыторыі таго ці іншага сельсавета. З просьбай аб працаўладкаванні да камісіі звярнуліся 43 чалавекі. На канкрэтныя рабочыя месцы было накіравана 38 чалавек. З іх 22 не з'явіліся да наймальнікаў па прапанаваных вакансіях, што сведчыць пра нізкую ступень зацікаўленасці саміх саіскальнікаў.

Асаблівы раздзел дзейнасці камісіі называецца прафілактычнай работай з асобамі, якія вядуць асацыяльны лад жыцця. Апошнім часам камісія працавала з адзінаццаццю такімі грамадзянамі. Чацвёра з іх атрымалі работу, праўда, невядома, колькі яны там пратрымаюцца.

Старшыня райсавета адзначае, што члены камісіі падыходзяць да справы не фармальна. З кожным чалавекам вядзецца індывідуальная работа, высвятляюцца прычыны незанятасці, вядзецца кансультаванне, прапануецца канкрэтная дапамога. Калі чалавек трапіў у цяжкую жыццёвую сітуацыю, яго вызваляюць ад аплаты паслуг па поўным іх кошце. Але ж нярэдка прычынай незанятасці робіцца хранічнае нежаданне працаваць. Калі чалавек — лайдак, тады камісія нічым не можа дапамагчы. І, вядома, для членаў камісіі важней за ўсё працаваць на карысць тых, хто зацікаўлены ў працоўнай дзейнасці. Таму на парадку дня раённай улады — стварэнне новых рабочых месцаў, далейшая прафесійная падрыхтоўка і перападрыхтоўка беспрацоўных грамадзян. Асаблівая ўвага ададзена арганізацыі самазанятасці — вось і нядаўна раённая служба занятасці правяла семінар «Аб развіцці прадпрымальніцкай ініцыятывы», на які запрасілі ўсіх ахвотных.

**Святлана ЯСКЕВІЧ,**
*Пінскі раён.*

# У ХОЦІМСКУ ВУЧАЦЬ ІНІЦЫЯТЫЎНАСЦІ

## Як у раёне заахвочваюць людзей працаўладкоўвацца

**Хоцімскі раён не можа пахваліцца буйнымі прадпрыемствамі і вялікімі сельскагаспадарчымі холдынгамі. Але напружанай сітуацыі на мясцовым рынку працы, сцвярджаюць прадстаўнікі мясцовай улады, тут няма. Галоўнае, каб у самога чалавека было жаданне заняцца справай.**

### Ёсць работа нават для безнадзейных

Узровень беспрацоўя ў Хоцімскім раёне складае 0,4 %. «І за апошнія некалькі гадоў гэта лічба практычна не мянялася», — удакладняе **начальнік упраўлення па працы, занятасці і сацыяльнай абароне Хоцімскага райвыканкама Алена БАРАДЗЭНКА.** На пачатак гэтага тыдня ў раёне было больш за сто вакансій, прычым не хапае ў асноўным спецыялістаў — ветурачоў, інжынераў, эканамістаў, заатэхнікаў. Але ёсць і такія вакансіі, дзе дастаткова агульнай сярэдняй адукацыі: сакратар, прадавец, швачка, гардэробшчык, рабочы па комплекснай уборцы, жывёлавод. І зарплаты не самыя малыя. «Такога, каб людзі атрымоўвалі ніжэй за 400 рублёў, у нас няма», — заўважае Алена Барадзэнка.

Вядома, ёсць людзі, якія не ў курсе, што знайсці работу ў раёне не праблема. Таму тутэйшая камісія па садзейнічанні занятасці насельніцтва ідзе насустрач.

— Для нас няма невырашальных задач, — кажа яе кіраўнік, **старшыня райсавета дэпутатаў Яўген НІКАЛАЕНКА.** — У камісію ўваходзіць 32 чалавекі — прадстаўнікі самых розных службаў. І чалавек, які прыходзіць да нас, атрымлівае адказы на ўсе свае пытанні ў комплексе — і па пенсіях, і па падатках, і па сацыяльных ільготах... Некаторыя, каб апраўдаць сваю бяздзейнасць, пачынаюць скардзіцца, што іх нідзе не бяруць на работу, што на прыём да ўрача цяжка трапіць, што ў іх няма ніякай спецыяльнасці. Не можаш трапіць на прыём да ўрача? Падымаецца ўрач і здымае гэта пытанне. Няма спецыяльнасці? Тут жа прапануем варыянты.

— Аднойчы на камісію прыйшоў малады чалавек. Нідзе не працаваў, жыў за кошт бацькі. Сталі з ім размаўляць, і высветлілася, што ён умее рамантаваць машыны і ёсць жаданне заняцца гэтай справай, — расказвае Алена Барадзэнка. — Мы яму расказалі, як адкрыць сваю справу, як плаціць падаткі, як весці бізнес. І ён зразумеў, што гэта не так складана, як здавалася на першы погляд. Зарэгістраваўся ў якасці прадпрымальніка і працуе. Жылкамгас выдзеліў яму памяшканне ў арэнду.

— Існуе такое прадузятае меркаванне, што займацца сваёй справай вельмі рызыкоўна, — кажа старшыня райсавета. — Даводзіцца пераконваць людзей, казаць, што гэта, наадварот, дае магчымасць падыходзіць да справы творча, быць, як той казаў, незалежным. Чым больш чалавек будзе перажываць за сваю справу, тым больш будзе яго жаданне застацца тут і развівацца. Людзі бяруцца, і ў іх усё атрымліваецца.

Знаходзіцца работа нават для самых безнадзейных. Члены камісіі згадваюць, як да іх аднойчы прыйшоў мужчына з чамаданамі. Ён вызваліўся з турмы, дзе правёў дзесяць гадоў. Вярнуўся дамоў, а жыць няма дзе і ў кішэні пуста. У выніку адзін фермер, а такіх людзей таксама запрашаюць удзельнічаць у камісіі, прапанаваў ісці працаваць да яго. Яму якраз былі патрэбны падсобныя рабочыя. Выдзеліў небараку домік, забяспечыў прадуктамі і нават цыгарэтамі.


Вучоба для ахвотных пачаць новае працоўнае жыццё.

Камісія, дарэчы, не адзіны ў раёне спосаб працаўладкавацца. Шмат хто знаходзіць работу па лініі службы занятасці. Ахвотныя пачаць сваю справу атрымліваюць субсідыю. У сельскай мясцовасці яна складае 15 бюджэтаў пражытачнага мінімуму, у гарадской — 11. Сёлета двое скарысталіся такой магчымасцю. Адна з іх — шматдзетная маці. Яна родам з Мінска, але лёс склаўся так, што ў яе біяграфіі былі і судзімасць, і складаныя сямейныя выпрабаванні. Зараз яна адна выхоўвае чатырох дзяцей. Кім толькі не працавала, але больш за ўсё ёй падабалася шыць. У выніку вырашылася на самастойную дзейнасць. З дапамогай раённай службы занятасці падрыхтавала бізнес-план і атрымала субсідыю.

На ўліку камісіі і тыя, хто працуе за межамі краіны.

— Высвятлялі гэта далікатна, каб не крыўдзіць людзей, — адзначае Алена Мікалаеўна. — Тым, хто не працуе, давядзецца ж за камуналку ў стапрацэнтным памеры плаціць. Тлумачылі, што, каб гэтага пазбегнуць, трэба або ісці працаваць у нас, або прынесці даведку, што ёсць работа за межамі краіны. І жыхары прынесці. Шмат хто ездзіць у Расію, але ёсць такія, што зарабляюць грошы ў Казахстане, Польшчы і нават Турцыі. Адзін мужчына ў Растове жыве ўжо 16 гадоў, там у яго сям'я, кватэра, але зарэгістраваны ў нас. Праз родных даслаў звесткі пра сваю рэгістрацыю і даведку, што працуе. У Расіі ўжо цэлыя кланы з нашых утварыліся — будаўнікі, бухгалтары, прыбіральшчыцы, педагогі, менеджары. У асноўным жывуць і працуюць у Піцеры і Маскве.

Суразмоўцы малююць агульны партрэт грамадзяніна, незанятага ў эканоміцы раёна. 70 % з іх — мужчыны, узрост да 40 гадоў, адукацыя — школа або прафтэхвучылішча, перыяд працы — да 10 гадоў, афіцыйны працоўны стаж — пяць гадоў.

### Новая спецыяльнасць — новыя магчымасці

Для тых, хто зусім без прафесіі, існуе магчымасць перавучыцца. І для гэтага не трэба кудысьці ехаць.

— Сёння вось прыбылі да нас з Магілёва педагогі вучэбнага цэнтра ЖКГ, — кажа Алена Барадзэнка. — Мы запрасілі іх сюды, каб нашы жыхары маглі засвоіць новую спецыяльнасць на месцы — аператар кацельных установак цвёрдага паліва. Непрацуючыя грамадзяне будуць вучыцца за сродкі службы занятасці. Але ёсць тры чалавекі, якія пажадалі зрабіць гэта за свае грошы. Такі спосаб адукацыі насельніцтва мы практыкуем другі год, і вынікі ёсць. Людзі, якія працавалі за межамі Расіі, атрымалі гарантыю працаўладкавання на радзіме. І ўжо не жадаюць кудысьці ехаць.

Іван Шалепенкаў адзін з тых, хто вырашыў набыць новую спецыяльнасць. Кажа, што да гэтага 10 гадоў перыядычна працаваў у Расіі.

— Колькі ўжо можна ездзіць? — адказвае ён пытаннем на маё пытанне, чаму больш не падабаецца ездзіць на заробкі. — Здароўе ўжо не тое. Ды і грошы там не такія вялікія. Нявыгадна стала. Хочацца з сям'ёй пабыць. А там жыць даводзілася ў паходных умовах і карміць клапоў.

Пра магчымасць атрымаць прафесію Іван даведаўся, калі выклікалі на камісію. І адразу ж ухапіўся за гэтую прапанову. Спадзяецца, што пасля вучобы яму дапамогуць і працаўладкавацца.

### Дайсці да кожнага

У аграгарадку Забялышын жыве Валерый Гушча, у нядаўнім часе — чалавек без пэўнага месца жыхарства і нават без пашпарта.

Яўген Нікалаенка згадвае, што калі ён прыйшоў на камісію ў райвыканкам, усе падумалі, што перад імі дзед. Аказалася, што мужчыну ўсяго 45 гадоў. Проста жыццё складанае.

— І пашпарт яму зрабілі, і зарэгістравалі, і работу знайшлі, — кажа дэпутат. — Як той казаў, у чалавека не было ні дома, ні сям'і, ні радзімы, ні сцяга. Апусціўся і страціў воблік чалавечы. Быў на мяжы незвароту. Цяпер пачаў новае жыццё.

Вось ужо два месяцы Валерый Гушча працуе рабочым збожжатока ААТ «Бабуліна падвор'е». Пакуль ён абедае ў сталоўцы гаспадаркі, размаўляем са старшынёй Забялышынскага сельсавета Міхаілам Байковым.

— Да таго, як гэты чалавек трапіў у месца пазбаўлення волі, жыў у цёткі — разам пілі, вялі разгульны лад жыцця, у выніку пазбавіліся кватэры, — расказвае ён пра свайго падапечнага. — Зараз кажа, што хоча жыць нармальна. Калі пайшоў працаваць, адразу ж прыйшлі даўгі за былыя грахі — іскі на 560 рублёў. Ужо пачалі вылічваць гэтыя грошы з зарплаты. Але ён не абураецца, працуе спраўна. За два месяцы работы ніякіх заўваг.

Міхаіл Байкоў асабіста хварэе за кожнага беспрацоўнага. На тэрыторыі сельсавета жыве 926 чалавек, 52 % з іх працаздольныя.

— Шмат каго ўладкоўваем на работу, — кажа ён. — Сезон пачаўся, і людзі самі просяцца іх узяць. Сфарміравалі з ахвотных паляводчую брыгаду. Адзін малады хлопец пайшоў працаваць даглядчыкам жывёлы. Яшчэ аднаго працаўладкавалі праз цэнтр занятасці артапедам — абразае капыты жывёлам. Вельмі цяжкая работа, але мужчына спраўляецца.

> Партрэт грамадзяніна, не занятага ў эканоміцы раёна. 70 % з іх — мужчыны, узрост да 40 гадоў, адукацыя — школа або прафтэхвучылішча, перыяд працы — да 10 гадоў, афіцыйны працоўны стаж — пяць гадоў.

Хутка на парозе сталоўкі з'яўляецца Валерый Гушча. Прызнаецца, што абед быў смачны. Кажа, што новае жыццё яму падабаецца, але з жыллём пакуль праблемы. Знаёмы пусціў пажыць, але ж гэта часовы варыянт. Так што будзе старацца працаваць, каб атрымаць нешта сваё.

Дарэчы, нядаўна ў жыхароў Хоцімска з'явілася яшчэ адна магчымасць знайсці сваю справу. Раён стаў адным з дванаццаці, што ўвайшлі ў праект ЕС-ПРААН «Падтрымка эканамічнага развіцця на мясцовым узроўні ў Рэспубліцы Беларусь». Жыхароў заклікаюць паўдзельнічаць у конкурсе бізнес-ініцыятыў і паспрабаваць атрымаць грант ЕС на развіццё сваёй справы. Ужо нават прайшоў першы семінар.

**Нэлі ЗІГУЛЯ, фота аўтара.**


Старшыня дае парады Валерыю Гушчу.

# НЕАБХОДНЫ ТАЛЕНТ... ФРЭЗЕРОЎШЧЫКУ!

## У Віцебскай вобласці, якая мяжуе з Расіяй, узровень зарэгістраванага беспрацоўя летась не перавышаў 0,4 %

**Калі аналізаваць сітуацыю ў асобных рэгіёнах вобласці, найбольш праблемны — Віцебск. У абласным цэнтры колькасць зарэгістраваных беспрацоўных складала 605. Далей ідуць Аршанскі раён — 327 чалавек, Навапалацк — 245, Полацкі раён — 229.**



Дарэчы, як паведамілі ў Камітэце па працы, занятасці і сацыяльнай абароне Віцебскага аблвыканкама, сёння на кожнага беспрацоўнага прыходзіцца тры вакансіі.

І канешне, адна з задач мясцовай улады — паспрыяць, каб усе жыхары раёна, якім дазваляюць узрост і здароўе, працавалі.

У Оршы і наваколлях, як вядома, актыўна праводзіцца «перазагрузка» ў рамках адпаведнага ўказа і даручэнняў кіраўніка дзяржавы. Зразумела, што вялікая ўвага аддаецца стварэнню новых працоўных месцаў. Акцэнт робіцца на адпаведныя патрэбам часу, на якіх магчыма зарабляць добра, а яшчэ лепш — вельмі добра.

Каб рэанімаваць стратныя прадпрыемствы, іх далучаюць да холдынгаў. У прыватнасці, сёлета аршанскі інструментальны завод стаў часткай МТЗ. Нядаўна там упершыню арганізавалі Дзень адчыненых дзвярэй.

Як адзначыў у размове з карэспандэнтам «МС» **першы намеснік старшыні Аршанскага райвыканкама Сяргей ПАЦ,** такія акцыі — вельмі добрая рэклама для прадпрыемстваў, дзе ёсць кадравы голад. Хутка распачнуцца ўступныя кампаніі ў каледжы, ВНУ. І ў будучых абітурыентаў ёсць магчымасць на ўласныя вочы ўбачыць завод, фабрыку, дзе яны, магчыма, будуць працаваць.

Між іншым, нешта аналагічнае практыкавалася ў савецкія часы. Тады вучняў 8 і 10 класаў праводзілі за праходную, каб тыя маглі вызначыцца, ці хочуць у мантажнікі электравырабаў, кіроўцы трамвая, сувязісты і г. д.

Сяргей Пац удакладніў, што, каб на інструментальным заводзе хапала не проста кадраў, а высокакваліфікаваных, у профільным каледжы павялічаць набор на падрыхтоўку аператараў станкоў з лічбавым праграмным кіраваннем.

У навучальнай установе сёлета створаны рэсурсны цэнтр. Там ёсць магчымасць павысіць кваліфікацыю, не адстаць ад часу, каб абслугоўваць новыя станкі.

**Дырэктар аршанскага інструментальнага завода холдынга МТЗ Віталь МАНКЕВІЧ** не ўтойвае, што кадры ў дэфіцыце. Ён адзначыў, што гатовы працаўладкаваць усіх ахвотных. Але, канешне, у першую чаргу неабходна фрэзероўшчыкі, прадстаўнікі іншых станочных спецыяльнасцяў. На жаль, моладзь не жадае ісці працаваць за станок. Так, у каледжах рыхтуюць токараў, шліфоўшчыкаў, але пасля адпрацоўкі з дваццаці-трыццаці чалавек у найлепшым выпадку застаюцца працаваць адзін-два. Сыходзяць у розныя сферы: гандлю, транспарту, а хто ў войска... Пры гэтым на заводзе на ўмовах здзельнай аплаты працы і малады рабочы можа зарабляць да паўтары тысячы рублёў. Але, каб стаць добрым спецыялістам, бывае неабходна гадоў пяць. Толькі тады з упэўненасцю можна сказаць наконт таго, ці ёсць у станочніка талент.

Дарэчы, на прадпрыемстве ёсць прафесіяналы, якія вельмі добра зарабляюць, працуючы адначасова на некалькіх станках. Напрыклад, адразу на чатырох. Гэта шматстаночнае абслугоўванне, бадай, можна параўноўваць з майстэрствам жанглёра. Адпаведна павышаецца прадукцыйнасць, якасць на неабходным узроўні, падае сабекошт прадукцыі. На прадпрыемстве такое заахвочваецца.

**Памочнік Прэзідэнта — інспектар па Віцебскай вобласці Віталь ВОЎК** таксама завітаў у Дзень адкрытых дзвярэй на інструментальны завод. Ён адзначыў, што насамрэч даўно прыйшоў час рэкламаваць рабочыя спецыяльнасці. Згадаў, што пачаткоўцы ў прафесіі могуць узяць удзел у міжнародных чэмпіянатах WorldSkills, якія праводзяцца раз на два гады ў розных краінах. І мэта выпрабаванняў — вызначыць найлепшых прадстаўнікоў рабочых прафесій. Моладзь павінна не баяцца заводскіх варот. Наадварот, прадпрыемствы з новым абсталяваннем, тэхналогіямі, зразумела, пры гэтым з годнымі ўмовамі працы, — гарантыя стабільнасці і дастатку. Суразмоўнік выказаў упэўненасць у тым, што ва ўстановах адукацыі павінны ўлічваць патрэбы рынку працоўнай сілы. І вучыць трэба таму і так, каб сёння — у час хуткасных, фантастычных змен у вытворчасці — кадры былі адпаведнымі.



**Аляксандр ПУКШАНСКІ.**
**Фота БелТА.**

ТОЛЬКІ ЛІЧБЫ

# Калі беспрацоўных ведаюць у твар

### У Белстаце праінфармавалі, як змяняецца колькасць занятага насельніцтва краіны

**Паводле выбарачнага абследавання, узровень беспрацоўя насельніцтва ў працаздольным узросце ў цэлым па рэспубліцы паменшыўся з 5,6 % у 2017 годзе да 4,7 % летась.**

У 2017-м узровень беспрацоўя беларусаў складаў 7,2 % (занятыя былі 80,4 %), беларусак — 4 % (83,7 % занятых). Летась дынаміка захавалася: 5,9 % мужчын і 3,4 % жанчын былі беспрацоўнымі, а ўзровень занятасці склаў адпаведна 82 % і 84 %.

Узровень зарэгістраванага беспрацоўя паступова зніжаўся з 0,8 % у 2016 годзе да 0,5 % у 2017-м і 0,3% летась. У органах па працы, занятасці і сацыяльнай ахове ў 2016 годзе былі зарэгістраваныя 35 329 чалавек, у 2017-м — 22 863, у 2018-м — 12 481.

Самай працавітай вобласцю летась была Мінская: у Бярэзінскім, Дзяржынскім, Крупскім, Мінскім, Смалявіцкім і Старадарожскім раёнах узровень зарэгістраванага беспрацоўя трымаўся на 0,1 %. У іншых абласцях такі ж вынік прадэманстравалі Браслаўскі, Верхнядзвінскі, Лёзненскі і Шумілінскі раёны (Віцебская); Бераставіцкі і Гродзенскі (Гродзенская); Горацкі, Чавускі і Шклоўскі (Магілёўская). І сталіца краіны. А ў Камянецкім раёне Брэсцкай вобласці гэты паказчык у мінулым годзе быў 0,03 % — беспрацоўнымі былі чатыры жыхары раёна.

У Быхаўскім раёне Магілёўскай вобласці ў якасці беспрацоўных былі зарэгістраваныя пяцёра чалавек. Тэмпы на Быхаўшчыне кажуць самі за сябе: яшчэ ў 2016 годзе тут былі 62 беспрацоўныя, у 2017-м — 61 чалавек. Недалёка адышлі Чавускі, Бераставіцкі, Лёзненскі раёны з васьмю беспрацоўнымі і Шумілінскі са Старадарожскім — з дзевяццю беспрацоўнымі летась.

Колькасць занятага насельніцтва ў Беларусі пакрыху скарачаецца: з 4 405 650 чалавек у 2016 годзе да 4 353 643 у 2017-м і 4 335 458 у 2018-м. Рост колькасці занятых грамадзян назіраецца выключна ў Мінску: з 1 065 850 у 2016 годзе да 1 067 623 у 2017-м і 1 070 669 летась.

На наваствораныя рабочыя месцы ў краіне ў 2016 годзе працаўладкаваныя 71 420 чалавек, у 2017-м — 69 807, у 2018-м — 73 435 чалавек. Рост прадэманстравалі Віцебская (6 986 чалавек), Гомельская (7 558), Гродзенская (5 884), Мінская (11 931) і Магілёўская (5 020) вобласці.

Летась на высокапрадукцыйныя працоўныя месцы прынятыя 316 чалавек у Мінску, 87 у Мінскай вобласці, 40 — у Гродзенскай, 19 у Віцебскай, 17 у Брэсцкай, 12 у Гомельскай і 10 чалавек у Магілёўскай.

**Варвара МАРОЗАВА.**

ПАДЗЯКА

# НАВЯЛІ ПАРАДАК

Летась «Звязда» пісала пра тое, як на прылеглай да аднаго з ліцэяў Магілёва тэрыторыі актывіст заўважыў беспарадак (нумары ад 26.10.18 і 13.12.18). Карэспандэнт разам з ім прайшоўся па пляцоўцы, якая трапіла пад крытыку, і зафіксаваў факты бязладдзя. Прыемна паведаміць, што сітуацыя змянілася. Актывіст патэлефанаваў у карпункт і папрасіў падзякаваць кіраўніцтву ліцэя за наведзены парадак.

Актыўную пазіцыю ў навядзенні парадку на зямлі праявіў старшыня вулічкама № 5 Ленінскага раёна Магілёва, член Савета тэрытарыяльнага грамадскага самакіравання мікразоны № 4 Віталь Гардзееў. Ён карыстаецца ў мясцовага насельніцтва павагай за сваю прынцыповасць і неабыякавасць. Вось і ў гэтай сітуацыі ён не застаўся ўбаку. І вельмі задаволены, што яна выправілася.

— Цяпер гэта стала ўзорная пляцоўка, прыемна самаму паглядзець і іншым паказаць, — адзначыў ён.

**Извещение о повторном открытом аукционе по продаже права заключения договора аренды земельного участка для строительства объекта в городе Гродно 25 июня 2019 года**

| № лота | Наименование объекта | Местонахождение объекта | Площадь земельного участка (га) | Кадастровый номер | Начальная цена, руб. | Сумма задатка, руб. | Ориентировочная сумма расходов по подготовке земельно-кадастровой документации, руб. | Условие продажи и целевое назначение земельного участка |
|---|---|---|---|---|---|---|---|---|
| 1*. | Право аренды земельного участка У-2 сроком на 25 лет | Скидельское шоссе в районе Гродненской ТЭЦ-2 | 0,7446 | 440100000001010127 | 39 037,03 | 3 900,0 | 6533,78 | Строительство объекта производственного назначения |

* - земельный участок имеет ограничения.

Победитель аукциона обязан:

в установленном порядке получить разрешение на проведение проектно-изыскательских работ и разработать строительный проект на строительство объекта в срок, не превышающий 2 года;

приступить к занятию земельного участка в соответствии с целями и условиями его предоставления не позднее 6 месяцев со дня утверждения проектной документации юридическому лицу, индивидуальному предпринимателю, 1 года — гражданину;

осуществить строительство объекта в сроки, определенные проектно-сметной документацией.

В случае нарушения сроков проектирования и строительства в договоре аренды будут предусмотрены штрафные санкции.

Организатор аукциона: коммунальное унитарное предприятие по оказанию услуг «Гродненский центр недвижимости».

При оформлении заявления лицо, желающее принять участие в аукционе, представляет:

1. Копии платежных поручений о внесении **задатка** за подачу заявления на расчетный счет BY24 AKBB 3012 0000 4181 0400 0000 в филиале № 400 ГОУ ОАО АСБ «Беларусбанк», г. Гродно, БИК AKBBBY21400, УНП 590727594, получатель – коммунальное унитарное предприятие по оказанию услуг «Гродненский центр недвижимости», с отметкой банка-отправителя об их исполнении. **Юридическое лицо:** Доверенность, выданную представителю юридического лица (кроме случаев, когда юридическое лицо представляет его руководитель), одну копию учредительных документов. **Физическое лицо**: Паспорт, а в случае участия в аукционе представителя физического лица – паспорт и нотариально заверенную доверенность.

2. Платеж за право заключения договора аренды земельных участков осуществляется в течение 10 рабочих дней со дня утверждения протокола о результатах аукциона.

3. Победитель аукциона обязан в течение 10 рабочих дней со дня утверждения протокола о результатах аукциона возместить организатору аукциона затраты, связанные с организацией и проведением аукциона, возместить расходы по подготовке документации для проведения аукциона.

4. Всем желающим предоставляется возможность ознакомиться с объектом.

**Аукцион состоится 25 июня 2019 года в 12.00 в здании горисполкома по адресу: г. Гродно, пл. Ленина, 2/1**.

Заявления на участие в аукционах принимаются по адресу: г. Гродно, пл. Ленина, 2/1, кабинет № 407, в рабочие дни **с 8.00 до 13.00 и с 14.00 до 17.00 с 3 июня по 19 июня 2019 года**. Телефоны для справок в Гродно: **(0152) 72-05-37, 72-00-10**. Адрес сайта: www.grodno.gov.by

ІНІЦЫЯТЫВА

# МОСЦІК СТАРАСТЫ ВЁСКІ РУДНЯ

**Жыхары вёскі Рудня, што знаходзіцца ў Івацэвіцкім раёне Брэсцкай вобласці за 65 кіламетраў ад райцэнтра, удзячныя вясковаму старасту за яго ўважлівасць да патрэб аднавяскоўцаў. І пра сваю шчырую ўдзячнасць казалі з задавальненнем, паказвалі кулак з пальцам уверх, які ён «во, чалавек!» — Сцяпан ШЛЯЖКА.**

**Старшыня Рэчкаўскага сельсавета Ганна ЛАТЫШЭВІЧ** расказала, што на тэрыторыі сельсавета працуюць чатыры старасты. Яны з'яўляюцца першымі памочнікамі сельвыканкама ў рабоце з насельніцтвам, у вырашэнні пытанняў добраўпарадкавання населеных пунктаў. Сцяпан Шляжка абраны старастам толькі летась, але з першых дзён свайго выбрання пачаў праяўляць ініцыятыву ў добрых справах — малайчына.

Ён мясцовы жыхар. Працаваў у калгасе больш за 20 гадоў шафёрам і пасля яшчэ 18 гадоў леснікам у Рудненскім лясніцтве. Гаспадарлівы чалавек, са сваім трактарам. Сярод вяскоўцаў Сцяпан Шляжка — чалавек паважаны.

А тут папярэдні староста Іван Доўжык у размове паскардзіўся, што ў яго няма часу на грамадскую работу, шмат працуе. І раптам прапанаваў: «Паспрабуй ты».

— Я быў ужо пенсіянерам і згадзіўся. Калі на сельскім сходзе мяне абралі старастам, найперш узяўся за дарогі, якія даўным-даўно не ведалі рамонту.

У філіяла спецыялізаванай дарожна-рамонтнай арганізацыі «Івацэвіцкае ДРБУ-178», які адказвае за ўтрыманне вуліц населеных пунктаў раёна, па прычыне недахопу сродкаў доўгі час не даходзіла чарга да працяглых вуліц аддаленай вёскі. Таму новы стараста не стаў чакаць той чаргі, а са сваім трактарам браў людзей, чалавек пяць, і ехаў на руіны закінутай фермы. Там з дазволу старшыні ААТ «Горталь» збіралі будаўнічыя адходы пасля зносу старых жывёлагадоўчых памяшканняў: кавалкі цэглы, шчэбню, каменне — і гэтым будаўнічым смеццем «рамантавалі» самыя вялікія выбоіны на вуліцах з асфальтаваным пакрыццём: Партызанскай і Набярэжнай. І на вуліцы Партызанскай, першай, за якую ўзяліся, можна сказаць, вучыліся, як рабіць. Наступная вуліца атрымалася ўжо лепш, бо камяні спачатку акуратна выкладвалі ў ямінах, потым засыпалі гравіем, трамбавалі. Вынік атрымаўся зусім іншы.

За гэтай справай і людзі пачалі згуртоўвацца вакол старасты. Наступны крок — суботнік на могілках.

— Арганізаваў людзей, чатыры касілкі. Выкасілі, вынеслі галлё, смецце, траву ў кучы, а камунальнікі іх прыбралі. Цяпер у нас на могілках чыста, — кажа стараста.

Могілкі вёскі Рудня перададзены на баланс філіяла «Целяханскі» ДУВП «Івацэвіцкая ЖКГ» яшчэ ў 2015 годзе. Перад тым на ўсёй тэрыторыі могілак былі выдалены дрэвы. Але за наступныя гады па ўсіх могілках пайшла прорасць. Вось і давялося правесці некалькі суботнікаў, каб там зноў стала чыста і дагледжана.

Мы едзем са Сцяпанам Уладзіміравічам у цэнтр вёскі да магазіна. Тут, побач з вясковай крамай, устаноўлены па ініцыятыве старасты памятны знак з указаннем даты першага згадвання вёскі Рудня ў архіўных дакументах. Стараста паказвае:

— Спачатку тут зрэзалі дрэва, якое надта замінала. Паціху завёз пяску, каменя, на якім шыльда замацавана, кольца бетоннае. Каля пустуючага закінутага дома адно заўважыў, стаў цягнуць — зламалася. Другое таксама развалілася, а гэтае паставілі на жэсце, і я прыцягнуў трактарам. Яно таксама доўга ляжала каля пустуючага дома, а нам спатрэбілася. Бо на зямлі камень устанаўліваць, падумаў, неяк не вельмі будзе прыгожа, а на кальцо — іншая рэч. Трубкі з ланцугом вакол памятнага каменя даў Сяргей Мохар, мы з ім іх усталёўвалі. Потым купіў жалеза, прывaрыў вакол — загарадзь набыла закончаны выгляд. Сабраў грузчыкаў, паставілі, пафарбавалі. Адзін з мясцовых прадпрымальнікаў, які дапамагае па любым пытанні, сказаў: «Фарба — гэта мой клопат». Малайчына. З Івацэвіч прадпрымальнік Мікалай Кот (з Рудні родам) шыльду заказаў. І вось атрымалася. Дошка аб'яў таксама побач знайшла сваё месца.

**— Звесткі пра першае згадванне вёскі дзе шукалі?**

— Доўга не мог знайсці нічога. У Мінску нашы выхадцы ёсць, адзін з іх дапамог. Яго брат у Польшчы жыве і дзядзька. Яны ініцыявалі запыты ў нашы дзяржаўныя архівы, архівы Польшчы. Тры месяцы працавалі і знайшлі дакументы, па якіх першае згадванне пра Рудню датуецца 1673 годам.

**—Хто дапамагаў мосцік зрабіць?**

— цікаўлюся, гледзячы на новы ладны масток, які з'явіўся нядаўна ў Рудні і скарацію шлях да цэнтра цераз канал. За яго з'яўленне сяльчане вельмі ўдзячны старасту.

— Мосцік дапамагаў будаваць мой сусед Леанід Лінкевіч. Дошкі на яго выбраў з дроў. Завёз сваім трактарам на пілараму, растлумачыў, што на агульную справу. Работа мне каштавала б рублёў 40 капеек, а індывідуальны прадпрымальнік Вячаслаў Стаскевіч з такім задавальненнем — на агульную справу, нават пытання не ставіў пра аплату.



Фота Валерыя МІСКЕВІЧА

Стараста ў вёсцы — пастаць нумар адзін. Да яго звяртаюцца людзі з рознымі пытаннямі: магілу выкапаць, арганізаваць пахаванне, падкасіць, плот падладзіць... І самае галоўнае, жаданне ёсць у старасты займацца людскімі справамі. І жонка яго — малайчына, ніколі не папракнула, што асабісты трактар для патрэб вёскі працуе, што гаспадара няма ў хаце.

Дзецьмі таксама можна парадавацца. Адна дачка ў Івацэвічах галоўным бухгалтарам працуе, другая ў Рэчках — маці-гераіня. Сын працуе ў Івацэвічах у Прамбудэнерга. І сем унукаў бяруць прыклад з дзеда.

Гаварылі са старастам і пра школу. Базавая ў Рудні яшчэ ёсць, і пакуль школа ёсць — вёска жывая. У планах Сцяпана Уладзіміравіча паставіць помнік аднасяльчанам, што загінулі ў гады Вялікай Айчыннай вайны. «Бацька мой — удзельнік Вялікай Айчыннай, але я не з-за гэтага, гляджу за ўсіх людзей. А памяці аб іх няма, — кажа стараста. — Спонсар абяцаў грошай даць, бо сёння гэта, самі разумееце, дорага каштуе».

**— Дзе яго будзеце ўсталёўваць?**

— Ды тут, думаю, каля памятнага каменя. Месца самае высокае. Пэўна, адсюль Рудня пачыналася.

**Валянціна БОБРЫК,**
*г. Івацэвічы.*


## ИЗВЕЩЕНИЕ
### о проведении повторного аукциона

Государственное предприятие «Минский областной центр инвестиций и приватизации» *(организатор аукциона)* по поручению **ОАО «Борисовская швейная фабрика»** (продавец) проводит повторный открытый аукцион по продаже **изолированного помещения** общ. пл. 3 992,4 м. кв, инв. № 610/D-65612 по адресу: **г. Борисов, ул. Рубена Ибаррури, 9/1-3,** и имущества согласно перечню *(с перечнем можно ознакомиться у организатора торгов)*.

Начальная цена с НДС (20 %) – **166 195,90** бел. руб. Задаток 10 % от начальной цены – **16 619,00** бел. руб. ***Стоимость недвижимого имущества снижена на 85 %, стоимость имущества снижена на 50 %.***

Шаг аукциона – 5 %.

**Задатки перечисляются на р/с № BY55BPSB30121082600169330000 в ЦБУ № 701 ОАО «БПС-Сбербанк», г. Минск, БИК BPSBBY2X, УНП 690324015, государственное предприятие «Минский областной центр инвестиций и приватизации».**

Порядок проведения аукциона регламентирован Положением о порядке продажи имущества ликвидируемого юридического лица с публичных торгов, утвержденным постановлением Совета Министров Республики Беларусь от 08.01.2013 № 16. Договор купли-продажи должен быть подписан в течение 10 (десяти) рабочих дней после проведения аукциона. Оплата за объект производится в течение 30 (тридцати) календарных дней после подписания договора купли-продажи, если иное не предусмотрено договором купли-продажи. Затраты на организацию и проведение аукциона возмещает победитель торгов (покупатель). Предыдущее извещение опубликовано в газете «Звязда» от 31.10.2018. Аукцион состоится **11.06.2019 в 12.00** по адресу: г. Минск, ул. Чкалова, 5, каб. 324. Заявления на участие и необходимые документы принимаются по **10.06.2019 до 16.00** по указанному адресу. **Тел.: (8 017) 207-71-34, (8 029) 102-21-17.**

**Могилевский филиал РУП «Институт недвижимости и оценки» сообщает о проведении 27.06.2019 г. повторного открытого аукциона (первоначальная стоимость снижена)**

| |
|---|
| Лот № 1: **Капитальное строение с инв. № 710/С-59153 — Административное здание, площадь – 968,2 кв. м. Капитальное строение с инв. № 710/С-59154 — Гараж на 3 автомашины**, площадь – 71,9 кв. м, Капитальное строение с инв. № 710/С-77019 – Забор. Объекты, входящие в состав Лота № 1, расположены по адресу: Могилевская обл., г. Бобруйск, ул. Советская, д. 74, на земельном участке с кадастровым номером 741000000006001548, площадью — 0,1379 га. Начальная цена продажи: 434 000,00 бел. рублей с учетом НДС. Размер задатка: 43 400,00 бел. руб. |
| **Дата, время и место проведения аукциона: аукцион состоится 27 июня 2019 года в 12.00** по адресу: г. Могилев, ул. Первомайская, 77, к. 352. Подача заявок (осуществляется лично) и внесение задатка: по 26.06.2019 до 15.00 в рабочие дни с 8.30 до 12.30, с 13.30 до 16.30. Аукцион может быть отменен в любое время, но не позднее, чем за три дня до даты аукциона |
| **Расчетный счет для внесения задатка:** получатель платежа РУП «Институт недвижимости и оценки», УНП 190055182, р/с IBAN BY21BPSB30121543370109330000 в ОАО «БПС-Сбербанк», г. Минск, BIC банка BPSBBY2X |
| **Продавец:** ОАО «Спецмонтажстрой-179 г. Могилев», УНП 700012410, г. Могилев, Славгородское шоссе, 171, 47-60-02 |
| **Организатор аукциона:** Могилевский филиал РУП «Институт недвижимости и оценки» УНП 190055182, г. Могилев, ул. Первомайская, 77, к. 352, тел. + 375 (222) 72-41-14 |
| **Срок и условия оплаты:** победитель аукциона оплачивает вознаграждение за организацию и проведение аукциона, включающее в т. ч затраты на организацию аукциона в течение 3 (трех) рабочих дней со дня проведения аукциона. Победитель аукциона обязан в течение 10 (десяти) календарных дней со дня подписания протокола аукциона подписать договор купли-продажи предмета аукциона Оплата за предмет аукциона производится на условиях заключенного договора купли-продажи. Внесенный Победителем аукциона задаток засчитывается в счет оплаты за предмет аукциона |
| Информация о предыдущих аукционах была опубликована в номерах газеты «Звязда» от 01.11.18, 26.12.19, 16.02.2019 и 10.04.19 |
| **Дополнительную информацию можно получить по тел.: +37529-624-26-25; +37529 550-09-56** |

## ЗАО «Белреализация» объявляет аукцион

Организатор торгов: **ЗАО «Белреализация»** (УНП 191113330), 220089, г. Минск, ул. Уманская, 54, 4-й этаж паркинга, каб. 27, тел.: (8 017) 298-53-53; (8029) 690-54-09, **WWW.BELTORGI.BY**

Продавец: ООО «Стройдормашлизинг» (УНП 190799737) в лице управляющего по банкротству ООО «Зовель», тел. + 375 (29) 179-02-40.

Публичные торги в электронной форме в процедуре экономической несостоятельности (банкротства) будут проведены: **1 июля 2019 г. 09.00—17.00** на электронной торговой площадке **WWW.BELTORGI.BY.**

Предмет торгов – Шагающий экскаватор ЭШ 6,5/45-У, б/у, 1988 г. в. Начальная цена — 442 197,00 бел. руб. без НДС, шаг торгов – 5 %, задаток — 10 % от начальной цены предмета торгов. Местонахождение — карьеры в Чашникском р-не Витебской обл., телефон для ознакомления и осмотра +37529 698 53 18.

**Для участия в торгах необходимо** в срок по 28 июня 2019 г. 17.00 1) перечислить задаток по выбранному лоту на р/с BY06SOMA30120013860101000933 в ЗАО «Идея Банк», код SOMABY22, УНП 191113330, получатель – ЗАО «Белреализация», 2) подать заявку по выбранному лоту на участие в торгах на сайте WWW.BELTORGI.BY, 3) направить в отсканированном виде все прилагаемые к заявке документы по адресу: marketing@zalog.by (подробнее — в информации лота на сайте WWW.BELTORGI.BY).

Организатор торгов вправе отказаться от их проведения не позднее, чем за день до наступления даты проведения торгов. Торги проводятся при наличии не менее двух допущенных к участию в них участников. Победителем торгов признается лицо, предложившее наиболее высокую цену. Результаты торгов оформляются в виде протокола. Участнику, не выигравшему торги, задаток возвращается в течение 5 рабочих дней со дня проведения торгов. Победителю торгов задаток не возвращается и учитывается при окончательных расчетах по приобретению предмета торгов. Если заявка на участие в торгах подана только одним участником, торги признаются несостоявшимися. Предмет электронных торгов продается претенденту на покупку при его согласии по начальной цене, увеличенной на пять процентов.

Победитель торгов (претендент на покупку) обязан возместить сумму фактических затрат, связанных с организацией и проведением торгов, оплатить аукционный сбор, заключить договор купли-продажи в течение 5 рабочих дней со дня проведения торгов.



МЯСЦОВАЕ САМАКІРАВАННЕ
ГАЗЕТА ДЛЯ ВЫБАРШЧЫКАЎ І ДЭПУТАТАЎ МЯСЦОВЫХ САВЕТАЎ

**РЭГІСТРАЦЫЙНАЕ ПАСВЕДЧАННЕ № 15 ад 17 лютага 2009 года выдадзена Міністэрствам інфармацыі Рэспублікі Беларусь.**

**Заснавальнікі:** Савет Рэспублікі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, Палата прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, рэдакцыйна-выдавецкая ўстанова «Выдавецкі дом «Звязда».

**Дырэктар — галоўны рэдактар СУХАРУКАЎ Павел Якаўлевіч.**

**Адказны за выпуск: АНУФРЫЕВА В. А.**

Грамадскі савет: **ПАПКОЎ А. А.,** старшыня Пастаяннай камісіі Савета Рэспублікі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь па рэгіянальнай палітыцы і мясцовым самакіраванні; **ЦУПРЫК Л. А.**, старшыня Пастаяннай камісіі Палаты прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь па дзяржаўным будаўніцтве, мясцовым самакіраванні і рэгламенце; **ПАПКО В. М.**, намеснік старшыні Пастаяннай камісіі Палаты прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь па міжнародных справах; **БЕЛЯКОЎ А. Э.**, намеснік старшыні Пастаяннай камісіі Савета Рэспублікі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь па адукацыі, навуцы, культуры і сацыяльным развіцці; **ПАНАСЮК В. В.**, старшыня Мінскага гарадскога Савета дэпутатаў; **ДРЫЛЁНАК Т. Л.**, старшыня Лёзненскага раённага Савета дэпутатаў; **СУШЧАНКА М. Л.**, старшыня Глушанскага пасялковага Савета дэпутатаў Бабруйскага раёна.

**Выдавец — рэдакцыйна-выдавецкая ўстанова «Выдавецкі дом «Звязда»**

**АДРАС РЭДАКЦЫІ:**
220013, г. Мінск, вул. Б. Хмяльніцкага, 10 а.

**КАНТАКТНЫ ТЭЛЕФОН** 287 18 31;
**e-mail:** info@zviazda.by

**Газета аддрукавана ў Рэспубліканскім унітарным прадпрыемстве «Выдавецтва «Беларускі Дом друку». ЛП № 02330/106 ад 03.04.2009. 220013, г. Мінск, пр. Незалежнасці, 79.**

**Тыраж 20.008. Нумар падпісаны ў 19.30 30 мая 2019 года.**